КОНТРОЛЬНЫЙ
ЭКЗЕМПЛЯР

Установа адукацыі
“Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Рэктар ________ А.І.Жук
“18” ________ 2024 г.
Рэгістрацыйны № УД 31-2-98 / вуч.

# МАРФАЛОГІЯ

Вучэбная праграма ўстановы адукацыі па вучэбнай дысцыпліне
для спецыяльнасцей:

**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура);**
**6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы))**

2024 г.

Вучэбная праграма складзена на аснове Адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі АСВА 6-05-0113-02-2023 (02.08.2023, № 225), вучэбных планаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура (23.02.2023, № 048 – 2023/у); Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская) (23.02.2023, № 050 – 2023/у); Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (кітайская) (23.02.2023, № 049 – 2023/у))

**СКЛАДАЛЬНІКІ :**
Н.П.Лобань, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
В.В.Урбан, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт;
Н.А.Радзіваноўская, дацэнт кафедры мовазнаўства і лінгвадыдактыкі філалагічнага факультэта ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
М.Р.Прыгодзіч, прафесар кафедры беларускага мовазнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта, доктар філалагічных навук, прафесар;
А.П.Жыганава, дацэнт кафедры беларускай і зарубежнай літаратуры ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

**УЗГОДНЕНА:**
Намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце
дзяржаўнай установы адукацыі
«Гімназія № 18 г. Мінска імя І.С.Міранкова» ____________ М.У.Мінкевіч

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
Кафедрай мовазнаўства і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 10 ад 23.05.2024 г.)

Загадчык кафедры ____________ Д.В.Дзятко

Навукова-метадычным саветам установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка”
(пратакол № 8 ад 18.06 2024 г.)

Афармленне вучэбнай праграмы і суправаджаючых яе матэрыялаў дзеючым патрабаванням Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь адпавядае

Метадыст вучэбна-метадычнага
аддзела ____________ Я.В.Ціханава

Дырэктар бібліятэкі ____________ Н.П.Сяткоўская

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма вучэбнай дысцыпліны “Марфалогія” прызначана для студэнтаў установы адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” (спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура) 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (англійская, кітайская)), з’яўляецца дысцыплінай модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова” і ўваходзіць у сістэму лінгвістычнай падрыхтоўкі студэнтаў 2 курса філалагічнага факультэта.

Курс “Марфалогія” з’яўляецца складнікам модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова”, у якім раскрываюцца асноўныя заканамернасці сінхроннага развіцця сучаснай беларускай літаратурнай мовы і які выконвае асноўную ролю ў падрыхтоўцы спецыялістаў-філолагаў. Гэтым вызначаюцца мэта і задачы курса.

**Асноўная мэта выкладання дысцыпліны** – развіць і ўдасканаліць філалагічнае мысленне студэнтаў; сфарміраваць установкі на практычнае прымяненне атрыманых студэнтамі ведаў у іх будучай прафесійнай дзейнасці; падрыхтаваць высокакваліфікаваных спецыялістаў для выкладання беларускай мовы ў навучальных установах рознага тыпу.

**Задачы вывучэння дысцыпліны**:

– даць грунтоўныя веды аб разнастайных моўных з’явах;

– выпрацаваць навуковыя погляды на сістэму мовы на марфалагічным узроўні ў сучаснай беларускай літаратурнай мове;

– удасканаліць навыкі беларускага вуснага і пісьмовага маўлення;

– выпрацаваць грунтоўныя ўменні і навыкі самастойнага лінгвістычнага аналізу моўных адзінак, з’яў і фактаў.

*Месца вучэбнай дысцыпліны ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй.*

Вучэбная дысцыпліна “Марфалогія” адносіцца да цыкла вучэбных дысцыплін дзяржаўнага кампанента, з’яўляецца складнікам модуля “Сучасная беларуская літаратурная мова” і вывучаецца на працягу трэцяга і чацвёртага семестраў.

*Сувязь вучэбнай дысцыпліны з іншымі дысцыплінамі.*

Пры вывучэнні вучэбнай дысцыпліны прадугледжваецца пераемнасць і сувязь яе з іншымі лінгвістычнымі дысцыплінамі (“Уводзіны ў мовазнаўства”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Беларуская дыялекталогія”, “Культура маўлення педагога”), а таксама са школьным курсам беларускай мовы. Асаблівая ўвага пры выкладанні асобных тэм удзяляецца вывучэнню спецыфічных рыс сучаснай беларускай літаратурнай мовы, што з’яўляецца надзвычай важным ва ўмовах білінгвізму. Лекцыйныя і практычныя заняткі, прадугледжаныя вучэбным планам, узаемна звязаны і арганічна дапаўняюць адно аднаго, даючы магчымасць паглыбіць і ўдасканаліць набытыя веды. Пэўная колькасць тэм па вучэбнай дысцыпліне адведзена на самастойнае

вывучэнне. Такая праца прывівае навыкі самастойнай вучобы, выхоўвае ў студэнтаў адказнасць, будзіць імкненне да самаразвіцця.

У выніку вывучэння дысцыпліны студэнт павінен:

**ведаць:**

– сістэму сучаснай беларускай літаратурнай мовы на марфалагічным узроўні;

– лінгвістычную тэрміналогію;

– літаратурныя нормы (марфалагічныя) сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– прынцыпы і правілы беларускага правапісу;

**умець:**

– адбіраць, сістэматызаваць і правільна кваліфікаваць моўныя факты;

– праводзіць лінгвістычныя назіранні, рабіць абагульненні і вывады;

– выконваць марфалагічны аналіз розных часцін мовы;

– заўважаць і выпраўляць граматычныя памылкі;

**валодаць:**

– марфалагічнымі нормамі сучаснай беларускай літаратурнай мовы;

– асновамі культуры беларускага маўлення, якое ажыццяўляецца ў вуснай і пісьмовай формах;

– навыкамі лінгвістычнага моўнага разбору на марфалагічным узроўні моўнай сістэмы;

– навыкамі маўленча-камунікатыўнай дзейнасці.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Марфалогія” павінна забяспечыць фарміраванне базавай прафесійнай кампетэнцыі. Для студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура) базавай прафесійнай кампетэнцыі БПК 9: Тлумачыць і аналізаваць граматычныя з’явы сучаснай беларускай мовы ў адпаведнасці са спецыфікай разнастайных лексіка-граматычных разрадаў, для студэнтаў спецыяльнасці 6-05-0113-02 Філалагічная адукацыя (Беларуская мова і літаратура. Замежная мова (з указаннем мовы)) базавай прафесійнай кампетэнцыі БПК 9: Тлумачыць і аналізаваць граматычныя з’явы сучаснай беларускай мовы ў адпаведнасці са спецыфікай разнастайных лексіка-граматычных разрадаў.

У рамках адукацыйнага працэсу па вучэбнай дысцыпліне “Марфалогія” студэнт павінен набыць не толькі тэарэтычныя і практычныя веды, уменні і навыкі па спецыяльнасці, але і развіць свой каштоўнасна-асобасны, духоўны патэнцыял, сфарміраваць якасці патрыёта і грамадзяніна, гатовага да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, вытворчым, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

**Структура зместу вучэбнай дысцыпліны.**

У аснову структуравання зместу вучэбнага матэрыялу курса пакладзены прынцып тэматычнага падыходу, які прадугледжвае падзел вучэбнага матэрыялу на адносна самастойныя раздзелы (тэмы). Па кожнай вучэбнай тэме ў адпаведнасці з яе мэтамі і задачамі па фарміраванні і развіцці ў студэнтаў канкрэтных кампетэнцый выкладчык (кафедра) праектуе і рэалізуе канкрэтныя педагагічныя тэхналогіі.

Вучэбная дысцыпліна на дзённым аддзяленні чытаецца на 2 курсе ў 3-ім і 4-ым семестрах. У адпаведнасці з вучэбным планам установы вышэйшай адукацыі “Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка” на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Марфалогія” усяго 216 вучэбных гадзін, аўдыторных 112 гадзін (з іх лекцый – 56 гадзін, практычных – 56 гадзін): у 3 семестры ўсяго 108 гадзін, аўдыторных 52 гадзіны (26 гадзін лекцыйных і 26 гадзін практычных); у 4 семестры ўсяго 108 гадзін, аўдыторных 60 гадзін (30 гадзін лекцыйных і 30 гадзін практычных). На самастойную работу студэнтаў адводзіцца ўсяго 104 гадзіны (52 гадзіны ў 3 семестры і 52 гадзіны ў 4 семестры).

Форма атрымання вышэйшай адукацыі – дзённая. Форма прамежкавай атэстацыі – залік у 3 семестры і экзамен у чацвертым семестры.

Размеркаванне гадзін у семестры:

| семестр | усяго гадзін | аўды-торныя | лекцыі | прак-тычныя | самаст. работа | форма кантролю |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 3 | 108 | 52 | 26 | 26 | 56 | залік |
| 4 | 108 | 60 | 30 | 30 | 48 | экзамен |

Раздзелы (тэмы), па якіх праводзяцца рэйтынгавыя кантрольныя работы ў 4 семестры: тэмы 6.1 – 6.11 (“Дзеяслоў”) – рэйтынгавая кантрольная работа № 1; тэма 11.1 – 14.2 (“Службовыя часціны мовы”) – рэйтынгавая кантрольная работа № 2.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### 1. МАРФАЛОГІЯ

1.1 Марфалогія як граматычнае вучэнне аб слове.

Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі (граматычная катэгорыя, граматычнае значэнне, граматычная форма, словаформа).

Паняцце парадыгмы (сукупнасці граматычных формаў слова). Спосабы і сродкі выражэння граматычных значэнняў.

1.2 Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў.

Крытэрыі выдзялення і аб’яднання слоў у часціны мовы.

1.3 Сістэма часцін мовы ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.

Самастойныя і службовыя часціны мовы.

Дыскусійныя пытанні класіфікацыі часцін мовы ў навуковай літаратуры. Пераходныя з’явы ў сістэме часцін мовы.

### 2. НАЗОЎНІК

2.1 Назоўнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля.

Лексіка-семантычныя групы назоўнікаў.

Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў: агульныя і ўласныя, канкрэтныя і абстрактныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, асабовыя, зборныя, рэчыўныя, адзінкавыя (сінгулятывы).

Граматычныя катэгорыі назоўніка: род, лік, склон.

2.2 Катэгорыя роду назоўніка.

Вызначэнне роду паводле семантычных і граматычных (марфалагічных, сінтаксічных) прымет.

Назоўнікі, якія адной граматычнай формай абазначаюць асоб мужчынскага і жаночага полу.

Назоўнікі агульнага роду.

Несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

Вызначэнне роду нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур.

2.3 Катэгорыя ліку назоўніка, яе граматычнае выражэнне.

Адзіночналікавыя (singularia tantum) і множналікавыя (pluralia tantum) назоўнікі.

Рэшткі парнага ліку ў беларускай мове.

Несупадзенне ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.

2.4 Катэгорыя склону назоўніка. Асноўныя значэнні склонаў.

Форма клічнага склону ў беларускай мове.

2.5 Скланенне назоўнікаў. Сістэма скланення назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. Тыпы скланення. Парадыгма скланення назоўнікаў.

Першае скланенне назоўнікаў. Другое скланенне назоўнікаў. Трэцяе скланенне назоўнікаў.

Рознаскланяльныя назоўнікі.Нескланяльныя назоўнікі.

Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Варыянтныя канчаткі назоўнікаў у множным ліку.

Назоўнікі ад’ектыўнага і змешанага тыпу скланення.

Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў.

Формы назоўнікаў з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі.

2.6 Словаўтварэнне назоўнікаў.

Прыставачнае, суфіксальнае, прыставачна-суфіксальнае, нульсуфіксальнае словаўтварэнне назоўнікаў.

Прадуктыўныя і непрадуктыўныя афіксы назоўнікаў.

Утварэнне складаных і складанаскарочаных назоўнікаў (абрэвіятур).

Лексіка-семантычны спосаб утварэння назоўнікаў.

Марфалагічна-сінтаксічны спосаб утварэння назоўнікаў (субстантывацыя). Поўная, частковая і эліптычная субстантывацыя.

2.7 Марфалагічны аналіз назоўніка.

Апісанне назоўніка як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі.

## 3. ПРЫМЕТНІК

3.1 Прыметнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Граматычныя катэгорыі прыметніка (род, лік, склон), іх залежнасць ад адпаведных катэгорый назоўніка.

Лексіка-семантычныя групы прыметнікаў.

3.2 Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў (якасныя, адносныя, прыналежныя прыметнікі).

Якасныя прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці.

Адносныя прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці.

Прыналежныя (уласнапрыналежныя і агульнапрыналежныя) прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці.

Адрозненне якасных прыметнікаў ад адносных і прыналежных.

Пераход прыметнікаў з аднаго разраду ў другі.

Поўныя (членныя), кароткія (нячленныя) і сцягнутыя (усечаныя) формы якасных прыметнікаў, іх выкарыстанне ў сучаснай беларускай мове.

3.3 Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Простыя (сінтэтычныя) і складаныя (аналітычныя) формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання. Суплетыўныя формы. Спецыфіка элятыва ў беларускай мове.

Формы прыметнікаў са значэннем суб’ектыўнай ацэнкі і меры якасці. Памяншальна-ласкальныя і павелічальна-ўзмацняльныя суфіксы, суфіксы са значэннем непаўнаты і высокай меры якасці.

3.4 Скланенне прыметнікаў.

Канчаткі прыметнікаў адзіночнага ліку.

Варыянтныя канчаткі прыметнікаў жаночага роду ў родным і творным склонах адзіночнага ліку.

Канчаткі прыметнікаў множнага ліку.

Асаблівасці скланення прыналежных прыметнікаў.

3.5 Словаўтварэнне прыметнікаў. Прыставачнае (прэфіксальнае), суфіксальнае, прыставачна-суфіксальнае, нульсуфіксальнае словаўтварэнне прыметнікаў.

Утварэнне складаных прыметнікаў.

Лексіка-семантычны спосаб утварэння прыметнікаў.

Спосабы і сродкі ўтварэння якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў.

Марфалагічна-сінтаксічны спосаб утварэння прыметнікаў (ад'ектывацыя).

3.6 Марфалагічны аналіз прыметніка.

Апісанне прыметніка як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі.

## 4. ЛІЧЭБНІК

4.1 Лічэбнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Лічэбнік як асаблівая часціна мовы і яго граматычныя катэгорыі.

Адрозненне лічэбнікаў ад слоў з лікавым значэннем.

4.2 Разрады лічэбнікаў паводле значэння: колькасныя (уласнаколькасныя, зборныя, дробавыя) і парадкавыя лічэбнікі.

4.3 Разрады лічэбнікаў паводле структуры: простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі.

Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі.

4.4 Скланенне колькасных і парадкавых лічэбнікаў.

Скланенне колькасных (уласнаколькасных, зборных, дробавых) і парадкавых лічэбнікаў.

Асаблівасці скланення простых, складаных і састаўных лічэбнікаў.

4.5 Марфалагічны аналіз лічэбніка.

Апісанне лічэбніка як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі.

4.6 Няпэўна-колькасныя словы.

Дыскусійныя пытанні класіфікацыі няпэўна-колькасных слоў у навуковай літаратуры.

## 5. ЗАЙМЕННІК

5.1 Займеннік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Групы займеннікаў паводле суадноснасці з іншымі часцінамі мовы: абагульнена-прадметныя, абагульнена-якасныя, абагульнена-колькасныя.

5.2 Разрады займеннікаў паводле значэння: асабовыя, зваротны, прыналежныя, указальныя, азначальныя, пытальныя, адносныя, адмоўныя і няпэўныя.

Лексіка-граматычная характарыстыка займеннікаў розных разрадаў.

5.3 Словаўтварэнне займеннікаў.

Прэфіксальнае, суфіксальнае, постфіксальнае словаўтварэнне займеннікаў.

Марфалагічна-сінтаксічны спосаб утварэння займеннікаў (пранаміналізацыя).

5.4 Скланенне займеннікаў.

Асаблівасці скланення асабовых, зваротнага, прыналежных, указальных, азначальных, пытальных, адносных, адмоўных і няпэўных займеннікаў.

5.5 Марфалагічны аналіз займенніка.

Апісанне займенніка як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі.

## 6. ДЗЕЯСЛОЎ

6.1 Дзеяслоў як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля дзеяслова.

Сістэма катэгорый і формаў дзеяслова.

Інфінітыў як пачатковая форма дзеяслова.

Паходжанне інфінітыва. Граматычныя катэгорыі інфінітыва. Суфіксы інфінітыва. Сінтаксічная роля інфінітыва.

Асновы дзеяслова: інфінітыва і цяперашняга (будучага простага) часу. Аснова прошлага часу. Утварэнне дзеяслоўных формаў ад гэтых асноў.

6.2 Пераходныя і непераходныя дзеясловы.

Зваротныя дзеясловы. Паходжанне постфікса -ся (-цца, -ца). Словаўтваральная і формаўтваральная функцыі постфікса -ся (-цца, -ца).

Значэнні зваротных дзеясловаў. Зваротныя дзеясловы, утвораныя ад пераходных і непераходных дзеясловаў.

Дзеясловы, якія ўжываюцца толькі як зваротныя (reflexiva tantum).

6.3 Катэгорыя стану дзеяслова. Пытанне пра стан дзеяслова ў сучаснай лінгвістыцы.

Залежны і незалежны стан дзеяслова. Сувязь катэгорыі стану з пераходнасцю/непераходнасцю, зваротнасцю/незваротнасцю.

Актыўныя і пасіўныя канструкцыі і іх ужыванне ў мове.

Дзеясловы незалежнага стану. Дзеясловы залежнага стану. Творны дзейнага прадмета (суб’екта) і творны сродку дзеяння пры дзеясловах залежнага стану.

6.4 Катэгорыя трывання дзеяслова. Сувязь катэгорыі трывання з катэгорыяй часу.

Дзеясловы закончанага і незакончанага трывання. Няпарныя (аднатрывальныя) дзеясловы. Дзеясловы са значэннем абодвух трыванняў (двухтрывальныя). Суадносныя пары трывання.

Спосабы ўтварэння трыванняў. Ступеннае ўтварэнне трывання. Трыванне дзеясловаў руху. Спосабы дзеяслоўнага дзеяння.

6.5 Прэдыкатыўныя катэгорыі дзеяслова (лад, час, асоба).

Катэгорыя ладу дзеяслова. Сувязь катэгорыі ладу з катэгорыяй часу.

Абвесны лад, яго значэнне.

Загадны лад, яго значэнне. Утварэнне формаў загаднага ладу. Ужыванне формаў загаднага ладу са значэннем іншых ладоў. Ужыванне формаў іншых ладоў і інфінітыва з пабуджальным значэннем.

Умоўны лад, яго значэнне і ўтварэнне. Паходжанне формы ўмоўнага ладу. Ужыванне формы ўмоўнага ладу.

6.6 Катэгорыя часу дзеяслова. Сувязь катэгорыі часу з катэгорыямі трывання і ладу. Абсалютны і адносны час.

Формы часу, іх утварэнне.

Цяперашні час, яго значэнне. Ужыванне формаў цяперашняга часу са значэннем іншых часоў.

Прошлы час, яго значэнне. Простая і складаная формы прошлага часу, іх паходжанне. Асаблівасці ўжывання складанай формы прошлага часу. Ужыванне формаў прошлага часу са значэннем іншых часоў.

Будучы час, яго формы і значэнні. Ужыванне формаў будучага часу са значэннем іншых часоў.

6.7 Катэгорыя асобы дзеяслова. Сувязь катэгорыі асобы з катэгорыямі ладу і часу.

Формы асобы, іх значэнне і ўжыванне. Ужыванне асабовых формаў з абагульнена-асабовым і няпэўна-асабовым значэннямі.

6.8 Безасабовыя дзеясловы. Семантычныя і граматычныя асаблівасці безасабовых дзеясловаў.

Уласна безасабовыя дзеясловы і асабовыя дзеясловы са значэннем безасабовых.

Зваротныя безасабовыя дзеясловы.

6.9 Спражэнне дзеясловаў.

Дзеясловы першага і другога спражэння і іх асабовыя канчаткі.

Рознаспрагальныя дзеясловы. Рэшткі нетэматычнага спражэння (дзеясловы есці, даць).

Спосабы вызначэння спражэння дзеясловаў.

6.10 Словаўтварэнне дзеясловаў.

Суфіксальнае, прыставачнае, постфіксальнае, прыставачна-суфіксальнае, суфіксальна-постфіксальнае, прыставачна-постфіксальнае, прыставачна-суфіксальна-постфіксальнае словаўтварэнне дзеясловаў. Утварэнне складаных дзеясловаў.

6.11 Марфалагічны аналіз інфінітыва і асабовых формаў дзеяслова.

Апісанне дзеяслова як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі.

## 7. ДЗЕЕПРЫМЕТНІК

7.1 Дзеепрыметнік як форма дзеяслова.

Дзеяслоўныя прыметы дзеепрыметніка (катэгорыі стану, трывання, часу; дзеяслоўнае кіраванне назоўнікамі; утварэнне дзеепрыметнікаў ад дзеяслоўных асноў). Адзнакі прыметніка (катэгорыі роду, ліку, склону).

Поўная і кароткая формы дзеепрыметніка. Сінтаксічная роля дзеепрыметніка.

7.2 Катэгорыя стану ў дзеепрыметнікаў.

Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне.

7.3 Ужыванне дзеепрыметнікаў.

Моўныя сродкі для замены неўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў пры перакладзе. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі (ад’ектывацыя).

7.4 Марфалагічны аналіз дзеепрыметніка.

Апісанне дзеепрыметніка як формы дзеяслова, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі.

## 8. ДЗЕЕПРЫСЛОЎЕ

8.1 Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова.

Дзеяслоўныя прыметы дзеепрыслоўя (катэгорыі трывання, стану; зваротная і незваротная формы; дзеяслоўнае кіраванне назоўнікамі; утварэнне дзеепрыслоўяў ад дзеяслоўных асноў). Адзнакі прыслоўя (нязменнасць, прымыканне да дзеяслова). Сінтаксічная роля дзеепрыслоўя.

8.2 Катэгорыя трывання ў дзеепрыслоўяў.

Дзеепрыслоўі незаконченага і законченага трывання, іх утварэнне.

8.3 Ужыванне дзеепрыслоўяў.

Асаблівасці ўжывання дзеепрыслоўяў у беларускай мове. Выпадкі пераходу дзеепрыслоўяў у прыслоўі (адвербіялізацыя).

8.4 Марфалагічны аналіз дзеепрыслоўя.

Апісанне дзеепрыслоўя як формы дзеяслова, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі.

## 9. ПРЫСЛОЎЕ

9.1 Прыслоўе як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Разрады прыслоўяў паводле значэння: азначальныя (якасныя, спосабу дзеяння, колькасныя (меры і ступені) і акалічнасныя (месца, часу, прычыны, мэты).

9.2 Ступені параўнання якасных прыслоўяў.

Простыя (сінтэтычныя) і складаныя (аналітычныя) формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання.

Формы суб’ектыўнай ацэнкі якасных прыслоўяў.

9.3 Словаўтварэнне прыслоўяў.

Утварэнне прыслоўяў ад розных часцін мовы (назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў, дзеясловаў). Словаўтварэнне прыслоўяў: суфіксальнае, прыставачнае, прыставачна-суфіксальнае, постфіксальнае. Утварэнне складаных прыслоўяў. Пераход слоў іншых часцін мовы ў прыслоўі (адвербіялізацыя).

9.4 Марфалагічны аналіз прыслоўя.

Апісанне прыслоўя як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі.

## 10. БЕЗАСАБОВА-ПРЭДЫКАТЫЎНЫЯ СЛОВЫ (СЛОВЫ КАТЭГОРЫІ СТАНУ)

10.1 Безасабова-прэдыкатыўныя словы (словы катэгорыі стану) як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

Пытанне аб безасабова-прэдыкатыўных словах у лінгвістычнай літаратуры.

Лексіка-семантычныя групы безасабова-прэдыкатыўных слоў. Групы безасабова-прэдыкатыўных слоў па суадноснасці з іншымі часцінамі мовы. Уласна безасабова-прэдыкатыўныя словы.

Ступені параўнання і формы ацэнкі безасабова-прэдыкатыўных слоў, суадносных з якаснымі прыслоўямі.

10.2 Марфалагічны аналіз безасабова-прэдыкатыўных слоў.

Апісанне безасабова-прэдыкатыўных слоў як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі.

## 11. СЛУЖБОВЫЯ ЧАСЦІНЫ МОВЫ

11.1 Паняцце пра службовыя часціны мовы.

Крытэрыі вылучэння службовых часцін мовы.

Пытанне аб службовых часцінах мовы ў лінгвістычнай літаратуры.

## 12. ПРЫНАЗОЎНІК

12.1 Прыназоўнік як службовая часціна мовы, яго функцыі.

Разрады прыназоўнікаў паводле паходжання: невытворныя і вытворныя (адыменныя, адпрыслоўныя, аддзеяслоўныя), іх адрозненне ад іншых часцін мовы.

Разрады прыназоўнікаў паводле структуры: простыя, складаныя і састаўныя.

Ужыванне прыназоўнікаў з рознымі склонамі (з адным, двума, трыма).

Значэнні прыназоўнікаў (прасторавае, часавае, прычыннае, аб’ектнае і інш.).

12.2 Ужыванне прыназоўнікаў.

Сінаніміка прыназоўнікавых канструкцый. Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове.

12.3 Марфалагічны аналіз прыназоўніка.

Апісанне прыназоўніка як службовай часціны мовы, вызначэнне разрадаў і значэння прыназоўнікаў.

## 13. ЗЛУЧНІК

13.1 Злучнік як службовая часціна мовы, яго функцыі.

Разрады злучнікаў паводле паходжання (невытворныя, вытворныя), паводле структуры (простыя, састаўныя), паводле спосабу ўжывання (адзіночныя, паўторныя, парныя) і функцыянальнага значэння (злучальныя, падпарадкавальныя).

Злучальныя злучнікі і іх групы (спалучальныя, супастаўляльныя, размеркавальныя). Далучальныя злучнікі. Паясняльныя злучнікі. Падпарадкавальныя злучнікі і іх групы (часавыя, прычынныя, мэтавыя, умоўныя, параўнальныя, уступальныя, тлумачальныя, выніковыя).

Адрозненне злучнікаў ад злучальных слоў – адносных займеннікаў і займеннікавых прыслоўяў.

13.2 Марфалагічны аналіз злучніка.

Апісанне злучніка як службовай часціны мовы, вызначэнне разрадаў злучнікаў.

## 14. ЧАСЦІЦА

14.1 Часціца як службовая часціна мовы, яе функцыі.

Разрады часціц паводле паходжання, структуры і функцыі. Часціцы, якія выражаюць розныя сэнсавыя адценні (указальныя, азначальна-ўдакладняльныя, вылучальна-абмежавальныя). Мадальныя часціцы (сцвярджальныя, адмоўныя, пытальныя, параўнальныя), мадальна-валявыя часціцы, эмацыйна-экспрэсіўныя часціцы (клічныя, узмацняльныя).

Формаўтваральныя і словаўтваральныя часціцы.

14.2 Марфалагічны аналіз часціцы.

Апісанне часціцы як службовай часціны мовы, вызначэнне разрадаў і функцый часціц.

## 15. МАДАЛЬНЫЯ СЛОВЫ

15.1 Мадальныя словы як асобая часціна мовы. Семантыка, структура і сінтаксічныя асаблівасці мадальных слоў.

Агульнае паняцце аб мадальнасці. Пытанне аб мадальных словах у лінгвістычнай літаратуры.

Разрады мадальных слоў паводле значэння. Суадноснасць мадальных слоў са словамі іншых часцін мовы.

15.2 Марфалагічны аналіз мадальных слоў.

Апісанне мадальных слоў як асобай часціны мовы, вызначэнне разрадаў, семантыкі і сінтаксічных асаблівасцей мадальных слоў.

## 16. ВЫКЛІЧНІК. ГУКАПЕРАЙМАЛЬНЫЯ СЛОВЫ

16.1 Выклічнік як асобая часціна мовы. Сэнсавыя асаблівасці, функцыі. Гукапераймальныя словы.

Разрады выклічнікаў паводле значэння (эмацыйныя, волевыяўленчыя, моўнага этыкету) і паводле паходжання (невытворныя, вытворныя).

Гукапераймальныя словы. Лексічная, марфалагічная і сінтаксічная характарыстыка гукаперайманняў. Адрозненне гукапераймальных слоў ад выклічнікаў.

**Вучэбна-метадычная карта дысцыпліны**
**(дзённая форма атрымання вышэйшай адукацыі)**

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная праца | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя | | | |
| **МАРФАЛОГІЯ** | | **26** | **26** | **56** | | |
| **1.** | **Марфалогія (іменныя часціны мовы)** | **2** | **2** | **6** | | |
| 1.1. | Марфалогія як граматычнае вучэнне аб слове. Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі (граматычная катэгорыя, граматычнае значэнне, граматычная форма, словаформа). Паняцце парадыгмы (сукупнасці граматычных формаў слова). Спосабы і сродкі выражэння граматычных значэнняў. | 1 | | | 1, 2,3, дад. 1 3, 6 | |
| 1.2. | Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў. Крытэрыі выдзялення і аб'яднання слоў у часціны мовы. | 1 | | | 1, 2,3, дад. 1 3, 6 | |
| 1.3 | Сістэма часцін мовы ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Самастойныя і службовыя часціны мовы. Дыскусійныя пытанні класіфікацыі часцін мовы ў навуковай літаратуры. Пераходныя з'явы ў сістэме часцін мовы. | | 2 | 2 2 2 | 1, 2, 3, дад. 1 3, 6 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| **2.** | **Назоўнік** | **10** | **8** | **20** | | |
| 2.1. | Назоўнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля. Лексіка-семантычныя групы назоўнікаў. | 2 | 2 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3, 6 | Ушчыльненае апытванне. Праверка практычных заданняў. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў: агульныя і ўласныя, канкрэтныя і абстрактныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, асабовыя, зборныя, рэчыўныя, адзінкавыя (сінгулятывы).<br>Граматычныя катэгорыі назоўніка: род, лік, склон. | | | | | |
| 2.2. | Катэгорыя роду назоўніка.<br>Вызначэнне роду паводле семантычных і граматычных (марфалагічных, сінтаксічных) прымет. | 2 | | | 1, 2, 3, дад. 1, 3, 6 | |
| | Назоўнікі, якія адной граматычнай формай абазначаюць асоб мужчынскага і жаночага полу.<br>Назоўнікі агульнага роду.<br>Несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Вызначэнне роду нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур. | | 1 | 2<br>2 | 1, 2, 3, дад.3, 4, 5 | Праверка выка-наных практыка-ванняў і заданняў. |
| 2.3. | Катэгорыя ліку назоўніка, яе граматычнае выражэнне.<br>Адзіночналікавыя (singularia tantum) і множналікавыя (pluralia tantum) назоўнікі. | 2 | | 2 | 1, 2, 3, дад.1, 3, 6 | Праверка канспекта і картатэкі моўных фактаў. |
| | Рэшткі парнага ліку ў беларускай мове.<br>Несупадзенне ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. | | 1 | 2 | 1, 2, 3, дад.3, 4, 5 | Праверка выкананых практыкаванняў і заданняў. |
| 2.4. | Катэгорыя склону назоўніка.<br>Асноўныя значэнні склонаў.<br>Форма клічнага склону ў беларускай мове. | 2 | | 2<br>2 | 2, дад.3, 4, 6 | Праверка канспектаў. |
| 2.5. | Скланенне назоўнікаў.<br>Сістэма скланення назоўнікаў у сучаснай беларускай мове. Тыпы скланення. Парадыгма скланення назоўнікаў. | 2 | | | 1, 2, 3, дад.1, 3,6 | |
| | Першае скланенне назоўнікаў. Другое скланенне назоўнікаў. Трэцяе скланенне назоўнікаў. Рознаскланяльныя назоўнікі. Нескланяльныя назоўнікі. | | 1 | | 1, 2, 3, дад.1, 3,6 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практычных заданняў. |
| | Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Варыянтныя канчаткі назоўнікаў у множным ліку. Назоўнікі ад’ектыўнага і змешанага тыпу скланення.<br>Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў.<br>Формы назоўнікаў з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі. | | 1 | 2<br>2 | 1, 2, 3, дад. 2,4,5 | Індывідуальнае апытванне, пра-верка выкананых практычных |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | | заданняў. |
| 2.6. | Словаўтварэнне назоўнікаў.<br>Прыставачнае, суфіксальнае, прыставачна-суфіксальнае, нульсуфіксальнае словаўтварэнне назоўнікаў. Прадуктыўныя і непрадуктыўныя афіксы назоўнікаў. Утварэнне складаных і складанаскарочаных назоўнікаў (абрэвіятур). Лексіка-семантычны спосаб утварэння назоўнікаў.<br>Марфалагічна-сінтаксічны спосаб утварэння назоўнікаў (субстантывацыя). Поўная, частковая і эліптычная субстантывацыя. | | 1 | 2<br><br><br><br><br>2 | 1, 2, 3, дад. 2,4,5 | Праверка выкананых практыкаванняў. Праверка канспектаў. |
| 2.7. | Марфалагічны аналіз назоўніка.<br>Апісанне назоўніка як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 2,4 | Марфалагічны разбор. Самастойная праца. |
| **3.** | **Прыметнік** | **6** | **6** | **12** | | |
| 3.1. | Прыметнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.<br>Граматычныя катэгорыі прыметніка (род, лік, склон), іх залежнасць ад адпаведных катэгорый назоўніка. | 1 | | | 1, 2, 3, дад. 1,3,6 | |
| | Лексіка-семантычныя групы прыметнікаў. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 3.6 | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 3.2. | Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў (якасныя, адносныя, прыналежныя прыметнікі).<br>Якасныя прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці. Адносныя прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці.<br>Прыналежныя (уласнапрыналежныя і агульнапрыналежныя) прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці. | 1 | | 2 | 1, 2, 3, дад. 1,3,6 | Праверка канспектаў. |
| | Адрозненне якасных прыметнікаў ад адносных і прыналежных. Пераход прыметнікаў з аднаго разраду ў другі.<br>Поўныя (члененныя), кароткія (нячленныя) і сцягнутыя (усечаныя) формы якасных прыметнікаў, іх выкарыстанне ў сучаснай беларускай мове. | | 1 | 2 | 1, 2, 3, дад. 2,4,5 | Ушчыльненае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 3.3. | Ступені параўнання якасных прыметнікаў.<br>Простыя (сінтэтычныя) і складаныя (аналітычныя) формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання. Суплетыўныя формы. Спецыфіка элятыва ў беларускай мове. | 1 | | 2 | 1, 2, 3, дад. 1,3,6 | Праверка канспектаў. |
| | Формы прыметнікаў са значэннем суб’ектыўнай ацэнкі і меры якасці.<br>Памяншальна-ласкальныя і павелічальна-ўзмацняльныя суфіксы, суфіксы са значэннем | | 2 | 2 | 1, 2, 3, дад. | Ушчыльненае апытванне. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | непаўнаты і высокай меры якасці. | | | | 3,4,5 | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 3.4. | Скланенне прыметнікаў.<br>Канчаткі прыметнікаў адзіночнага ліку. Варыянтныя канчаткі прыметнікаў жаночага роду ў родным і творным склонах адзіночнага ліку. Канчаткі прыметнікаў множнага ліку. Асаблівасці скланення прыналежных прыметнікаў. | 1 | | | 1, 2, 3, дад. 1,3,6 | |
| 3.5. | Словаўтварэнне прыметнікаў.<br>Прыставачнае (прэфіксальнае), суфіксальнае, прыставачна-суфіксальнае, нульсуфіксальнае словаўтварэнне прыметнікаў. Утварэнне складаных прыметнікаў.<br>Лексіка-семантычны спосаб утварэння прыметнікаў. | 2 | | 2<br>2 | 1, 2, 3, дад. 1,3,6 | Праверка канспектаў. |
| | Спосабы і сродкі ўтварэння якасных, адносных і прыналежных прыметнікаў. Марфалагічна-сінтаксічны спосаб утварэння прыметнікаў (ад’ектывацыя). | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 3,4 | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 3.6. | Марфалагічны аналіз прыметніка.<br>Апісанне прыметніка як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 3,4 | Марфалагічны разбор. Самастойная праца. |
| **4.** | **Лічэбнік** | **4** | **6** | **12** | | |
| 4.1. | Лічэбнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.<br>Лічэбнік як асаблівая часціна мовы і яго граматычныя катэгорыі.<br>Адрозненне лічэбнікаў ад слоў з лікавым значэннем. | 1 | | | 1, 2, 3, дад. 1,3,6 | |
| 4.2. | Разрады лічэбнікаў паводле значэння: колькасныя (уласнаколькасныя, зборныя, дробавыя) і парадкавыя лічэбнікі. | 1 | 1 | 4 | 1, 2, 3, дад. 1,3,6 | Ушчыльненае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 4.3. | Разрады лічэбнікаў паводле структуры: простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі. | 1 | 1 | | 1, 2, 3, дад. 1,3,6 | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| | Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі. | | 2 | 4 | 1, 2, 3, дад. 3,4 | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 4.4. | Скланенне колькасных і парадкавых лічэбнікаў. | | 1 | 2 | 1, 2, 3, | Ушчыльненае |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Скланенне колькасных (уласнаколькасных, зборных, дробавых) і парадкавых лічэбнікаў. Асаблівасці скланення простых, складаных і састаўных лічэбнікаў. | | | | дад. 3,4 | апытванне. |
| 4.5. | Марфалагічны аналіз лічэбніка.<br>Апісанне лічэбніка як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 3,4 | Марфалагічны разбор. Самастойная праца. |
| 4.6. | Няпэўна-колькасныя словы.<br>Дыскусійныя пытанні класіфікацыі няпэўна-колькасных слоў у навуковай літаратуры. | 1 | | 2 | 2, дад. 1,4 | Праверка канспектаў. |
| **5.** | **Займеннік** | **4** | **4** | **6** | | |
| 5.1. | Займеннік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.<br>Групы займеннікаў паводле суадноснасці з іншымі часцінамі мовы: абагульнена-прадметныя, абагульнена-якасныя, абагульнена-колькасныя. | 1 | | 2 | 1, 2, 3, дад. 1,3,6 | Праверка канспектаў. |
| 5.2. | Разрады займеннікаў паводле значэння: асабовыя, зваротны, прыналежныя, указальныя, азначальныя, пытальныя, адносныя, адмоўныя і няпэўныя. | 1 | | | 1, 2, 3, дад. 1,3,6 | |
| | Лексіка-граматычная характарыстыка займеннікаў розных разрадаў. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 3,4 | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 5.3. | Словаўтварэнне займеннікаў.<br>Прэфіксальнае, суфіксальнае, постфіксальнае словаўтварэнне займеннікаў. Марфалагічна-сінтаксічны спосаб утварэння займеннікаў (пранаміналізацыя). | 1 | 1 | 2 | 1, 2, 3, 3д, 4д, 5д | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 5.4. | Скланенне займеннікаў. | 1 | | | 1, 2, 3 | |
| | Асаблівасці скланення асабовых, зваротных, прыналежных, указальных, азначальных, пытальных, адносных, адмоўных і няпэўных займеннікаў. | | 1 | 2 | 1, 2, 3, дад. 3,4,5 | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 5.5. | Марфалагічны аналіз займенніка.<br>Апісанне займенніка як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 3,4 | Марфалагічны разбор. Самастойная праца. |
| | ***Усяго гадзін у 3 семестры: 108 г.*** | ***26*** | ***26*** | ***56*** | | ***Залік*** |

| № раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Самастойная праца | Літаратура | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя заняткі | | | |
| **МАРФАЛОГІЯ** | | **30** | **30** | **48** | | |
| **6.** | **Дзеяслоў** | **12** | **8** | **26** | | |
| 6.1. | Дзеяслоў як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля дзеяслова. Сістэма катэгорый і формаў дзеяслова. Інфінітыў як пачатковая форма дзеяслова. Асновы дзеяслова.<br>Катэгорыі дзеяслова: трыванне, стан, лад, час, асоба; лік і род. Пераходнасць, зваротнасць як марфалагічныя асаблівасці дзеяслова. Сістэма дзеяслоўных формаў. Зменныя (спрагальныя і скланяльныя) і нязменныя формы.<br>Інфінітыў як пачатковая форма дзеяслова. Паходжанне інфінітыва. Граматычныя катэгорыі інфінітыва. Суфіксы інфінітыва. Сінтаксічная роля інфінітыва.<br>Асновы дзеяслова: інфінітыва і цяперашняга (будучага простага) часу. Аснова прошлага часу. Утварэнне дзеяслоўных формаў ад гэтых асноў. | 2 | | 2 | 1, 2, 3 дад. 1,2,3, 6 | Праверка выкананых практычных заданняў. |
| 6.2. | Пераходныя і непераходныя дзеясловы.<br>Зваротныя дзеясловы. Паходжанне постфікса *-ся (-цца, -ца).* Словаўтваральная і формаўтваральная функцыі постфікса *-ся* (*-цца, -ца*).<br>Значэнні зваротных дзеясловаў. Зваротныя дзеясловы, утвораныя ад пераходных і непераходных дзеясловаў. Дзеясловы, якія ўжываюцца толькі як зваротныя (reflexiva tantum). | 2 | 2 | 2<br>2 | 1, 2, 3 дад. 1,2,3, 6 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практыкаванняў. |
| 6.3 | Катэгорыя стану дзеяслова. Пытанне пра стан дзеяслова ў сучаснай лінгвістыцы. Залежны і незалежны стан зеяслова.<br>Сувязь катэгорыі стану з пераходнасцю/непераходнасцю, зваротнасцю/незваротнасцю. | 2 | | 2 | 1, 2, 3 дад. 1,2,3, 6 | Праверка канспектаў і выкананых практычных заданняў. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Актыўныя і пасіўныя канструкцыі і іх ужыванне ў мове. Дзеясловы незалежнага стану. Дзеясловы залежнага стану.<br>Творны дзейнага прадмета (суб'екта) і творны сродку дзеяння пры дзеясловах залежнага стану. | | 1 | 2 | 1, 2, 3 дад. 1,2,3, 6 | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практыкаванняў. |
| 6.4 | Катэгорыя трывання дзеяслова. Сувязь катэгорыі трывання з катэгорыя часу. Дзеясловы закончанага і незакончанага трывання. Няпарныя (аднатрывальныя) дзеясловы. Дзеясловы са значэннем абодвух трыванняў (двухтрывальныя). | 2 | | 2 | 1, 2, 3, дад. 1,2,3, 6 | Праверка канспектаў. |
| | Суадносныя пары трывання. Спосабы ўтварэння трыванняў. Ступеннае ўтварэнне трывання. Трыванне дзеясловаў руху. Спосабы дзеяслоўнага дзеяння. | | 1 | 2 | | Індывідуальнае апытванне, праверка выкананых практыкаванняў. |
| 6.5 | Прэдыкатыўныя катэгорыі дзеяслова (лад, час, асоба).<br>Катэгорыя ладу дзеяслова. Сувязь катэгорыі ладу з катэгорыяй часу. Абвесны лад, яго значэнне. Загадны лад, яго значэнне і ўтварэнне.<br>Ужыванне формаў загаднага ладу са значэннем іншых ладоў.<br>Ужыванне формаў іншых ладоў з пабуджальным значэннем.Умоўны лад, яго значэнне і ўтварэнне. Паходжанне формы ўмоўнага ладу. Ужыванне формы ўмоўнага ладу. | 2 | | 2<br>2 | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Праверка выкананых практычных заданняў. |
| 6.6 | Катэгорыя часу дзеяслова. Сувязь катэгорыі часу з катэгорыямі трывання і ладу. Абсалютны і адносны час. Формы часу, іх утварэнне. Цяперашні час, яго значэнне. Ужыванне формаў цяперашняга часу са значэннем іншых часоў. Прошлы час, яго значэнне. Простая і складаная формы прошлага часу, іх паходжанне.<br>Ужыванне формаў прошлага часу са значэннем іншых часоў. Будучы час, яго формы і значэнні.<br>Ужыванне формаў будучага часу са значэннем іншых часоў. | | 1 | 2<br>2<br>2 | 1, 2, 3 дад. 1,2,3, 6 | Ушчыльненае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 6.7 | Катэгорыя асобы дзеяслова.<br>Сувязь катэгорыі асобы з катэгорыямі ладу і часу. Формы асобы, іх значэнне і ўжыванне.<br>Ужыванне асабовых формаў з абагульнена-асабовым і няпэўна-асабовым значэннямі. | 1 | | 2 | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Праверка выкананых практычных заданняў. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 6.8 | Безасабовыя дзеясловы.<br>Семантычныя і граматычныя асаблівасці. Уласна безасабовыя дзеясловы і асабовыя дзеясловы са значэннем безасабовых. Зваротныя безасабовыя дзеясловы. | 1 | | | 1, 2, 3 дад. 1, 2,3,6 | |
| 6.9 | Спражэнне дзеясловаў.<br>Дзеясловы I і II спражэння і іх асабовыя канчаткі. Рознаспрагальныя дзеясловы. Рэшткі нетэматычнага спражэння (дзеясловы *есці, даць*). Спосабы вызначэння спражэння дзеясловаў. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 6.10 | Словаўтварэнне дзеясловаў.<br>Суфіксальнае, прыставачнае, постфіксальнае, прыставачна-суфіксальнае, суфіксальна-постфіксальнае, прыставачна-постфіксальнае, прыставачна-суфіксальна-постфіксальнае словаўтварэнне дзеясловаў. Утварэнне складаных дзеясловаў. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Праверка выкананых практыкаванняў. Самастойная праца. |
| 6.11 | Марфалагічны аналіз інфінітыва і асабовых формаў дзеяслова.<br>Апісанне дзеяслова як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі. Актуалізацыя і кантроль апорных ведаў, уменняў і навыкаў па тэме "Дзеяслоў". | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 па тэмах 6.1 – 6.11. |
| **7.** | **Дзеепрыметнік** | **2** | **4** | **6** | | |
| 7.1 | Дзеепрыметнік як форма дзеяслова. Дзеяслоўныя прыметы дзеепрыметніка. Адзнакі прыметніка. Поўная і кароткая формы дзеепрыметніка. Сінтаксічная роля дзеепрыметніка. | 1 | | | 1, 2, 3 дад. 1, 3,2,6 | |
| 7.2 | Катэгорыя стану ў дзеепрыметнікаў.<br>Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне. | 1 | | 2 | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Праверка канспектаў. |
| 7.3 | Ужыванне дзеепрыметнікаў.<br>Моўныя сродкі для замены неўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў пры перакладзе.<br>Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі (ад'ектывацыя). | | 2 | 2<br>2 | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Вусныя паведам-ленні. Індывідуальнае апытванне, правер-ка выкананых прак-тычных заданняў і канспектаў. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 7.4 | Марфалагічны аналіз дзеепрыметніка.<br>Апісанне дзеепрыметніка як формы дзеяслова, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі. | | 2 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Ушчыльненае апытванне.Марфалагічныразбор.Самастойная праца. |
| **8.** | **Дзеепрыслоўе** | **2** | **4** | **4** | | |
| 8.1 | Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова.<br>Дзеяслоўныя прыметы дзеепрыслоўя. Адзнакі прыслоўя. Сінтаксічная роля дзеепрыслоўя. | 1 | | | 1, 2, 3 дад. 1, 3,2,6 | |
| 8.2 | Катэгорыя трывання ў дзеепрыслоўяў.<br>Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трывання, іх утварэнне. | 1 | | 2 | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Праверка канспектаў. |
| 8.3 | Ужыванне дзеепрыслоўяў.<br>Асаблівасці ўжывання дзеепрыслоўяў у беларускай мове. Выпадкі пераходу дзеепрыслоўяў у прыслоўі (адвербіялізацыя). | | 2 | 2 | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Індывідуальнае апытванне, правер-ка выкананых прак-тычных заданняў. Праца з тэкстамі і слоўнікамі. |
| 8.4 | Марфалагічны аналіз дзеепрыслоўя.<br>Апісанне дзеепрыслоўя як формы дзеяслова, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі. | | 2 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Ушчыльненае апытванне. Марфалагічны разбор. Самастойная праца. |
| **9.** | **Прыслоўе** | **2** | **4** | **2** | | |
| 9.1 | Прыслоўе як часціна мовы. Катэгарыяльнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.<br>Разрады прыслоўяў паводле значэння: азначальныя (якасныя, спосабу дзеяння, колькасныя (меры і ступені) і акалічнасныя (месца, часу, прычыны, мэты) | 2 | | | 1, 2, 3 дад. 1, 3,4,6 | |
| 9.2 | Ступені параўнання якасных прыслоўяў.<br>Простыя (сінтэтычныя) і складаныя (аналітычныя) формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання.<br>Формы суб'ектыўнай ацэнкі якасных прыслоўяў. | | 2 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Індывідуальнае апытванне, пра-верка выкананых практычных заданняў. |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 9.3 | Словаўтварэнне прыслоўяў.<br>Утварэнне прыслоўяў ад розных часцін мовы (назоўнікаў, прыметнікаў, лічэбнікаў, займеннікаў, дзеясловаў). Словаўтварэнне прыслоўяў: суфіксальнае, прыставачнае, прыставачна-суфіксальнае, постфіксальнае. Утварэнне складаных прыслоўяў. Пераход слоў іншых часцін мовы ў прыслоўі (адвербіялізацыя). | | 1 | 2 | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Праверка выкананых практыкаванняў. Індывідуальнае апытванне. |
| 9.4 | Марфалагічны аналіз прыслоўя.<br>Апісанне прыслоўя як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Марфалагічны разбор. Самастойная праца. |
| **10.** | **Безасабова-прэдыкатыўныя словы (словы катэгорыі стану)** | **2** | **2** | **2** | | |
| 10.1 | Безасабова-прэдыкатыўныя словы (словы катэгорыі стану) як часціна мовы. Катэгарыяльнае значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.<br>Пытанне аб безасабова-прэдыкатыўных словах у лінгвістычнай літаратуры. Лексіка-семантычныя групы безасабова-прэдыкатыўных слоў. Групы безасабова-прэдыкатыўных слоў па суадноснасці з іншымі часцінамі мовы. Уласна безасабова-прэдыкатыўныя словы.<br>Ступені параўнання і формы ацэнкі безасабова-прэдыкатыўных слоў, суадносных з якаснымі прыслоўямі. | 2 | | 2 | 1, 2, 3 дад. 1, 3,2,6 | Праверка выкананых практычных заданняў. |
| 10.2 | Марфалагічны аналіз безасабова-прэдыкатыўных слоў.<br>Апісанне безасабова-прэдыкатыўных слоў як часціны мовы, вызначэнне граматычных катэгорый і сінтаксічнай ролі. | | 2 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Марфалагічны разбор. Самастойная праца. |
| **11.** | **Службовыя часціны мовы** | **1** | | | | |
| 11.1. | Паняцце пра службовыя часціны мовы.<br>Крытэрыі вылучэння службовых часцін мовы. Пытанне аб службовых часцінах мовы ў лінгвістычнай літаратуры. | 1 | | | 1, 2, 3 дад. 1, 3,2,6 | |
| **12.** | **Прыназоўнік** | **3** | **2** | **2** | | |
| 12.1 | Прыназоўнік як службовая часціна мовы, яго функцыі.<br>Разрады прыназоўнікаў паводле паходжання: невытворныя і вытворныя (адыменныя, адпрыслоўныя, аддзеяслоўныя), іх адрозненне ад іншых часцін мовы. | 1 | | | 1, 2, 3 дад. 1, 3,26 | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Разрады прыназоўнікаў паводле структуры: простыя, складаныя і састаўныя. Ужыванне прыназоўнікаў з рознымі склонамі (з адным, двума, трыма). Значэнне прыназоўнікаў (прасторавае, часавае і інш.) | 2 | | | 1, 2, 3 дад. 1, 3,26 | Індывідуальнае апытванне. Праверка выкананых практыкаванняў. |
| 12.2 | Разрады прыназоўнікаў і іх ужыванне.<br>Сінаніміка прыназоўнікавых канструкцый. Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове. | | 1 | 2 | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Праверка выкананых практыкаванняў. Праверка канспектаў. |
| 12.3 | Марфалагічны аналіз прыназоўніка.<br>Апісанне прыназоўніка як службовай часціны мовы, вызначэнне разрадаў і значэння прыназоўнікаў. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Марфалагічны разбор. Самастойная праца. |
| **13.** | **Злучнік** | **2** | **2** | **2** | | |
| 13.1 | Злучнік як службовая часціна мовы.<br>Разрады злучнікаў паводле паходжання, паводле структуры, паводле спосабу ўжывання і функцыянальнага значэння. Злучальныя злучнікі і іх групы. Далучальныя і паясняльныя злучнікі. Падпарадкавальныя злучнікі і іх групы.<br>Адрозненне злучнікаў ад злучальных слоў – адносных займеннікаў і займеннікавых прыслоўяў. | 2 | | 2 | 1, 2, 3 дад. 1, 3,2,6 | Праверка выкананых практычных заданняў. |
| 13.2 | Марфалагічны аналіз злучніка.<br>Апісанне злучніка як службовай часціны мовы, вызначэнне разрадаў злучнікаў. | | 2 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Праверка выкананых практычных заданняў. Самастойная праца. |
| **14.** | **Часціца** | **2** | **2** | **2** | | |
| 14.1 | Часціца як службовая часціна мовы, яе функцыі.<br>Разрады часціц паводле паходжання, структуры і функцыі. Часціцы, якія выражаюць розныя сэнсавыя адцэнні (указальныя, азначальна-ўдакладняльныя і інш.). Мадальныя, мадальна-валявыя, эмацыянальна-экспрэсіўныя часціцы. Формаўтваральныя і словаўтваральныя часціцы. | 2 | | 2 | 1, 2, 3 дад. 1, 3,2,6 | раверка выкананых практычных заданняў. |
| 14.2 | Марфалагічны аналіз часціцы.<br>Апісанне часціцы як службовай часціны мовы, вызначэнне разрадаў і функцый часціц. | | 2 | | 1, 2, 3, дад. | Марфалагічны разбор. Рэйтынгавая |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | 1, 3,4,6 | кантрольная работа № 2 па тэмах 11.1 – 14.2. |
| **15.** | **Мадальныя словы** | **1** | **1** | | | |
| 15.1 | Мадальныя словы як асобая часціна мовы. Семантыка, структура і сінтаксічныя асаблівасці мадальных слоў.<br>Агульнае паняцце аб мадальнасці. Пытанне аб мадальных словах у лінгвістычнай літаратуры. Разрады мадальных слоў паводле значэння. Суадноснасць мадальных слоў са словамі іншых часцін мовы. | 1 | | | 1, 2, 3 дад. 1, 3,2,6 | |
| 15.2 | Марфалагічны аналіз мадальных слоў.<br>Апісанне мадальных слоў як асобай часціны мовы, вызначэнне разрадаў, семантыкі і сінтаксічных асаблівасцей мадальных слоў. | | 1 | | 1, 2, 3, дад. 1, 3,4,6 | Марфалагічны разбор. Самастойная праца. |
| **16.** | **Выклічнік. Гукапераймальныя словы** | **1** | **1** | **2** | | |
| 16.1 | Выклічнік як асобая часціна мовы. Сэнсавыя асаблівасці, функцыі.<br>Разрады выклічнікаў паводле значэння і паводле паходжання. Гукапераймальныя словы.<br>Лексічная, марфалагічная і сінтаксічная характарыстыка гукаперайманняў.<br>Адрозненне гукапераймальных слоў ад выклічнікаў. | 1 | 1 | 2 | 1, 2, 3 дад. 1, 3,2,6 | Марфалагічны разбор. Самастойная праца. Праверка выкананых практычных заданняў. |
| | ***Усяго гадзін у 4 семестры: 108 г.*** | ***30*** | ***30*** | ***48*** | | ***Экзамен*** |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## ЛІТАРАТУРА


**Асноўная літаратура**

1. Сучасная беларуская літаратурная мова [Электронны рэсурс] : вучэб.-метад. комплекс для спецыяльнасцей 1-02 03 01 «Беларуская мова і літаратура», 1-02 03 03 «Беларуская мова і літаратура. Замежная мова» / склад.: Н. П. Лобань, В. В. Урбан, С. С. Мароз // Репозиторий БГПУ. – Рэжым доступу: https://elib.bspu.by/handle/doc/44202. – Дата доступу: 11.04.2024.
2. Сучасная беларуская мова : вучэб. дапам. для навучэнцаў установаў адукацыі, якія рэалізуюць адукац. праграмы сярэд. спец. адукацыі па спецыяльнасцях профілю адукацыі «Педагогіка» / В. У. Азарка [і інш.] ; пад рэд. А. С. Васілеўскай. – 2-е выд., выпр. – Мінск : Рэсп. ін-т праф. адукацыі, 2022. – 383 с.

**Дадатковая літаратура**

1. Кароткая граматыка беларускай мовы : у 2 ч. / НАН Беларусі, Ін-т мовазнаўства ; навук. рэд. А. А. Лукашанец. – Мінск : Беларус. навука, 2007–2009. – Ч. 1 : Фаналогія. Марфаналогія. Марфалогія. – 2007. – 351 с.
2. Плотнікаў, Б. А. Беларуская мова : лінгвіст. кампендыум / Б. А. Плотнікаў, Л. А. Антанюк. – Мінск : Інтэрпрэссэрвіс : Кн. дом, 2003. – 672 с.
3. Сучасная беларуская літаратурная мова : вучэб. дапам. для студэнтаў установаў выш. адукацыі па філал. спецыяльнасцях / Д. В. Дзятко [і інш.] ; пад рэд. Д. В. Дзятко. – Мінск : Выш. шк., 2017. – 588 с.
4. Сучасная беларуская літаратурная мова : практ. заняткі : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / Н. В. Гаўрош [і інш.]. – 3-е выд., дапрац. і дап. – Мінск : Выш. шк., 1995. – 287 с.
5. Сучасная беларуская літаратурная мова. Марфалогія : вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / Н. В. Гаўрош [і інш.] ; пад агул. рэд. М. С. Яўневіча. – Мінск : Выд. У. М. Скакун, 1997. – 288 с.
6. Сучасная беларуская літаратурная мова : тэсты для тэмат. кантролю : вучэб. дапам. для студэнтаў філал. фак. установаў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / аўт.-склад.: А. І. Калечыц [і інш.] ; пад рэд. П. А. Міхайлава. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2006. – 280 с.
7. Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў : у 12 т. – Мінск : Беларус. Энцыкл., 2009– . – Т. 7 : Беларуская мова / пад агул. рэд. Д. В. Дзятко. – 2017. – 495 с.

# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА АРГАНІЗАЦЫІ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

Адной з галоўных задач, якія стаяць перад вышэйшай школай, з’яўляецца павышэнне якасці падрыхтоўкі будучых спецыялістаў. Будучы выпускнік павінен не толькі атрымліваць веды па прадметах, якія прадугледжаны вучэбнымі праграмамі, авалодваць уменнямі і навыкамі выкарыстання гэтых ведаў, метадамі даследчай работы, але і ўмець самастойна набыць новыя навуковыя звесткі.

Сістэматычна арганізаваная самастойная работа студэнтаў з’яўляецца асноўным сродкам падрыхтоўкі да самастойнай дзейнасці, а змест, метады і формы выступаюць у ролі фактараў, якія ўплываюць на дадзеную падрыхтоўку.

Арганізацыя самастойнай работы студэнтаў дзённага аддзялення накіравана на вырашэнне наступных задач:

– паўтарэнне, замацаванне і абагульненне раней атрыманых ведаў;

– удасканаленне прадметных навыкаў, фарміраванне даследчых уменняў і навыкаў;

– актывізацыя вучэбнай і навукова-даследчыцкай дзейнасці студэнтаў;

– фарміраванне гатоўнасці студэнтаў да самаадукацыі.

Крыніцай інфармацыі пры выкананні студэнтамі самастойнай работы могуць выступаць: канспект; друкаваныя матэрыялы; падручнікі і слоўнікі; матэрыялы на электронных носьбітах.

План самастойнай работы прадугледжвае: форму работы, змест (аб’ём) работы, тэрмін выканання, віды кантролю.

У залежнасці ад месца і часу правядзення самастойнай працы, характару кіраўніцтва ёю з боку выкладчыка і спосабу кантролю за яе вынікамі падзяляецца на наступныя віды:

– самастойную працу падчас асноўных аўдыторных заняткаў (лекцый, семінараў);

– самастойную працу пад кантролем выкладчыка ў форме планавых кансультацый, творчых кантактаў, залікаў і экзаменаў;

– пазааўдыторную самастойную працу пры выкананні студэнтамі дамашніх заданняў навучальнага і творчага характару.

Самастойнасць пералічаных вышэй відаў прац досыць умоўная, і ў рэальным адукацыйным працэсе гэтыя віды перасякаюцца адзін з адным.

Самастойная праца студэнтаў дзённай формы атрымання адукацыі дастаткова разнастайная, яна можа прадугледжваць:

– выкананне самастойных работ;

– выкананне кантрольных работ, складанне схем, табліц;

– працу з даведачнай, метадычнай і навуковай літаратурай па мовазнаўстве;

– абарону выкананых работ;

– падрыхтоўку да дыскусій, канферэнцый;

– падрыхтоўку да тэсціравання і інш.

Асноўныя віды заданняў для самастойнай працы:

– вывучэнне навуковых і вучэбных тэкстаў (падручнікі, першакрыніцы, дадатковая літаратура);

– складанне плана тэксту;

– графічнае адлюстраванне структуры тэксту;

– канспектаванне тэксту;

– праца са слоўнікамі, даведнікамі;

–азнаямленне з нарматыўнымі дакументамі;

– вучэбна-даследчыцкая дзейнасць;

– выкарыстанне аўдыя- і відэазапісаў.

Для замацавання і сістэматызацыі ведаў, набытых студэнтамі самастойна, выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– праца з канспектам лекцыі (апрацоўка тэксту), паўторная работа над вучэбным матэрыялам (з падручнікаў, першакрыніц, дадатковай літаратуры і інш.);

– складанне планаў і тэзісаў адказаў;

– складанне табліц для сістэматызацыі навучальнага матэрыялу;

– вывучэнне нарматыўных матэрыялаў;

– адказы на кантрольныя пытанні;

– падрыхтоўка паведамленняў да выступлення на семінары, канферэнцыі;

– падрыхтоўка рэфератаў, дакладаў;

– складанне бібліяграфіі і інш.

Для фарміравання ўменняў выкарыстоўваюцца наступныя віды дзейнасці:

– выкананне практыкаванняў па ўзоры;

– рашэнне варыянтных заданняў і практыкаванняў;

– выкананне схем, табліц і пад.;

– рэфлексіўны аналіз прафесійных уменняў з выкарыстаннем аўдыя- і відэатэхнікі і інш.

Віды заданняў для самастойнай працы, іх змест і характар могуць мець варыятыўны і дыферэнцыяваны характар, улічваць спецыфіку матэрыялу, які выносіцца на самастойнае вывучэнне.

Сярод канкрэтных відаў самастойнай работы рэкамендуецца выкарыстоўваць наступныя:

а) самастойная работа па ўзоры (перанос вядомага спосабу ў аналагічную сітуацыю);

б) рэканструктыўна-варыятыўная самастойная работа (перанос вядомага спосабу з некаторай мадыфікацыяй у незнаёмую сітуацыю);

в) эўрыстычная самастойная работа (перанос вядомых спосабаў у нестандартную сітуацыю, дзякуючы чаму, самастойная работа набывае даследчы характар).

Для правядзення кантролю самастойнай працы студэнтаў выкарыстоўваюцца:

– праверка індывідуальных заданняў;

– семінарскія заняткі;

– калёквіумы;

– канферэнцыі;

– залікі па тэмах / раздзелах;

– тэсціраванне;

– кантрольныя работы;

– вусны і пісьмовы экзамены.

Для кантролю эфектыўнасці арганізацыі самастойнай працы студэнтаў можна праводзіць анкетаванне, падчас якога выяўляецца карыснасць тых ці іншых відаў і арганізацыйных формаў самастойнай працы, правільнасць і своечасовасць іх уключэння ў навучальны працэс, дастатковасць метадычнага забеспячэння, адпаведнасць запланаванага часу на іх выкананне і г. д.

Крытэрыямі адзнакі вынікаў самастойнай працы студэнта могуць з'яўляцца:

– узровень засваення студэнтам вучэбнага матэрыялу;

– уменне студэнта выкарыстоўваць тэарэтычныя веды пры выкананні практычных задач;

– абгрунтаванасць і выразнасць выкладу адказу;

– афармленне матэрыялу ў адпаведнасці з патрабаваннямі стандартаў;

– сфарміраваныя ўменні і навыкі ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі вывучэння дысцыпліны.

Самастойная праца студэнтаў можа быць паспяховай толькі ў выпадку яе правільнай арганізацыі, неабходнага метадычнага суправаджэння, дзейснага кантролю, абавязковай сістэматызацыі, а пры неабходнасці і карэкцыі ведаў, атрыманых студэнтамі самастойна.

Важным змястоўным элементам самастойнай працы з'яўляецца работа студэнтаў над памылкамі, дапушчанымі пры выкананні задання. Выкладчык толькі падкрэслівае словы і выразы, у якіх назіраецца памылковае напісанне ці ўжыванне, даючы студэнту магчымасць разабрацца з імі самастойна, г. з. зрабіць гэтыя недахопы аб'ектамі свядомай мэтанакіраванай работы.

## ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫКАНАННЯ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

### 3 семестр

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 1.3. | Сістэма часцін мовы ў сучаснай беларускай літаратурнай мове.<br>Дыскусійныя пытанні класіфікацыі часцін мовы ў навуковай літаратуры.<br>Пераходныя з'явы ў сістэме часцін мовы. | 2<br>2<br>2 | Падрыхтаваць даклад "Дыскусійныя пытанні класіфікацыі часцін мовы ў навуковай літаратуры".<br>Падрыхтаваць прэзентацыю па дадзеным пытанні.<br>Падрыхтаваць вуснае выказванне на тэму "Пераходныя з'явы ў сістэме часцін мовы", выкарыстоўваючы выданне "Беларуская мова: энцыклапедыя" (Мінск, 1994). | Даклад<br>Прэзентацыя<br>Вуснае выказванне |
| 2.2 | Назоўнікі агульнага роду. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула Наркевіч А.І. Назоўнік. Назоўнікі агульнага роду // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005) | Канспект |
| 2.2. | Несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. | 2 | Выпісаць з перакладных беларуска-рускіх слоўнікаў 20 прыкладаў назоўнікаў, у якіх назіраецца несупадзенне роду ў беларускай і рускай мовах. | Картатэка моўных фактаў. Праца са слоўнікамі |
| 2.3 | Адзіночналікавыя (singularia tantum) і множналікавыя (pluralia tantum) назоўнікі. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула Наркевіч А.І. Назоўнік. Назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку. Назоўнікі, якія ўжываюцца толькі ў множным ліку // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005) | Канспект |
| 2.3. | Несупадзенне ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. | 2 | Выпісаць з перакладных беларуска-рускіх слоўнікаў 20 прыкладаў назоўнікаў, у якіх назіраецца несупадзенне ліку ў беларускай і рускай мовах. | Картатэка моўных фактаў. Праца са слоўнікамі |
| 2.4 | Катэгорыя склону назоўніка. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула Рамза Т.Р. Дынаміка варыянтных формаў роднага склону // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005) | Канспект |
| 2.4. | Асноўныя значэнні склонаў. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула Арашонкава Г.У. Пытанні нармалізацыі форм меснага склону адзіночнага ліку назоўнікаў мужчынскага роду з чыстай асновай у беларускай літаратурнай мове // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005) | |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 2.5 | Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў. | 2 | Праскланяць пісьмова наступныя назоўнікі: *Мікола Віславус, Віка Захарка, Алена Сініца, Сіплівеня* | Практыкаванне |
| 2.5 | Формы назоўнікаў з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі. | 2 | *Аляксандр, Ваўкавыск, Баранавічы, Залессе, Кобрын, Ашмяны.* Падрыхтаваць канспект § 27 “Формы назоўнікаў з суфіксамі ацэнкі” // “Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам.” (Мінск, 1997). | Канспект |
| 2.6 | Словаўтварэнне назоўнікаў. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула “Утварэнне назоўнікаў” // Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў у 12 т. Т. 7 (Мінск, 2017) | Канспект |
| 2.6. | Марфалагічна-сінтаксічны спосаб утварэння назоўнікаў. | 2 | Выпісаць з ТСБЛМ або ТСБМ 10 прыметнікаў (і іх дэфініцыі), утвораных шляхам ад’ектывацыі. | Практыкаванне |
| 3.2 | Прыналежныя (уласнапрыналежныя і агульнапрыналежныя) прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула Сяцко П.У. Святло Купалавага дому ці… Купалава дому? Прыналежныя прыметнікі і іх склонавыя формы // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005) | Канспект |
| 3.2 | Поўныя (членныя), кароткія (нячленныя) і сцягнутыя (усечаныя) формы якасных прыметнікаў, іх выкарыстанне ў сучаснай беларускай мове. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 137–139 // Ф. Янкоўскі. Гістарычная граматыка беларускай мовы (Мінск, 1983). | Канспект |
| 3.3. | Простыя (сінтэтычныя) і складаныя (аналітычныя) формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання. | 2 | Утварыць па магчымасці ўсе формы параўнання наступных прыметнікаў: *вялікі, шчыры, разумны, кепскі, дарослы, салодкі, вішнёвы, шэравокі, жывы, вясенні, руплівы, старанны.* | Практыкаванне |
| 3.3. | Памяншальна-ласкальныя і павелічальна-ўзмацняльныя суфіксы, суфіксы са значэннем непаўнаты і высокай меры якасці. | 2 | Утварыць па тры прыметнікі з дапамогай прыставак *за-, звыш-, ультра-, архі-* і суфіксаў *-ізн-, -эзн-,-эразн-, -энн-, -еньк-, -эньк-* (*-аньк-*), *-юсеньк-* (*-юсенечк-*),*-явеньк-, -ютк-, -ав-* (*-яв-*), *-ават-* (*-яват-*). | Практыкаванне |
| 3.5. | Словаўтварэнне прыметнікаў. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 35 “Утварэнне прыметнікаў” // “Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам.” (Мінск, 1997). | Канспект |
| 3.5 | Прыставачнае (прэфіксальнае), суфіксальнае, прыставачна-суфіксальнае, нульсуфіксальнае словаўтварэнне прыметнікаў. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула Сяцко П.У. *Урыўкавы* ці *адрывачны*? Асаблівасці ўтварэння некаторых адносных і якасных прыметнікаў // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005) | Канспект |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 4.2 | Разрады лічэбнікаў паводле значэння: колькасныя (уласнаколькасныя, зборныя, дробавыя) і парадкавыя лічэбнікі. | 4 | Падрыхтаваць канспект артыкула Супрун А.Я. Зборныя лічэбнікі ў беларускай мове // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005)<br>Падрыхтаваць канспект артыкула Мельнікава Л.А. Словаўтварэнне колькасных лічэбнікаў у беларускай і рускай мовах // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005) | Канспект |
| 4.3. | Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі. | 4 | Падрыхтаваць канспект § 40 “Сінтаксічная сувязь лічэбнікаў з назоўнікамі” // “Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам.” (Мінск, 1997).<br>Падрыхтаваць канспект артыкула Супрун А.Я. Дапасаванне выказніка да колькаснага дзейніка ў беларускай мове // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005) | Канспект |
| 4.4 | Скланенне колькасных і парадкавых лічэбнікаў, іх паходжанне. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 137–139 // Ф. Янкоўскі. Гістарычная граматыка беларускай мовы (Мінск, 1983). | Канспект |
| 4.6 | Няпэўна-колькасныя словы. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула “Няпэўна-колькасныя словы” // Энцыклапедыя для школьнікаў і студэнтаў у 12 т. Т. 7 (Мінск, 2017) | Канспект |
| 5.1 | Займеннік як часціна мовы. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула Сцяшковіч Т.Ф. Займеннік у беларускай мове // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005) | Канспект |
| 5.3. | Прэфіксальнае, суфіксальнае, постфіксальнае словаўтварэнне займеннікаў. | 2 | Падрыхтаваць канспект раздзела “Словаўтварэнне займеннікаў” // “Беларуская граматыка: у 2-х ч. Ч. 1. Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск” (Мінск, 1985). | Канспект |
| 5.4. | Асаблівасці скланення асабовых, зваротнага, прыналежных, указальных, азначальных, пытальных, адносных, адмоўных і няпэўных займеннікаў. | 2 | Праскланяць наступныя займеннікі: *мы, яны, усякі, сам, самы, што, ніхто, які-ніякі, хто-небудзь, вы, кожны, гэты*. | Практыка-ванне |
| | **ВСЕГО** | **56** | | |

## 4 семестр

| № п/п | Назва тэмы, раздзела | К-сць гадзін на СРС | Заданне | Форма выканання |
|---|---|---|---|---|
| 6.1. | Асновы дзеяслова: інфінітыва і цяперашняга (будучага простага) часу. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 426, 427 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванні |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 6.2. | Пераходныя і непераходныя дзеясловы. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 429, 430 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванні |
| 6.2. | Зваротныя дзеясловы, утвораныя ад пераходных і непераходных дзеясловаў. | 2 | Выпісаць з “Граматычнага слоўніка дзеяслова” (Мінск, 2013) па 15 зваротных дзеясловаў, утвораных ад пераходных і непераходных дзеясловаў | Картатэка моўных фактаў. Праца са слоўнікамі |
| 6.3. | Сувязь катэгорыі стану з пераходнасцю/ непераходнасцю, зваротнасцю/ незваротнасцю. | 2 | Знайсці матэрыял па праблеме “Сувязь катэгорыі стану з пераходнасцю/ непераходнасцю, зваротнасцю/ незваротнасцю”, выкарыстоўваючы дапаможнік “Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам.” (Мінск, 1997), і законспектваць яго. | Тэзіснае канспекта-ванне |
| 6.3. | Творны дзейнага прадмета (суб’екта) і творны сродку дзеяння пры дзеясловах залежнага стану. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 439 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 6.4. | Сувязь катэгорыі трывання з катэгорыяй часу. | 2 | Знайсці матэрыял па праблеме “Сувязь катэгорыі стану з пераходнасцю/ непераходнасцю, зваротнасцю/ незваротнасцю”, выкарыстоўваючы дапаможнік “Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам.” (Мінск, 1997), і законспектваць яго. | Канспект |
| 6.4. | Спосабы ўтварэння трыванняў. Ступеннае ўтварэнне трывання. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 62 “Утварэнне суадносных пар трывання” // “Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам.” (Мінск, 1997). | Канспект |
| 6.5. | Ужыванне формаў загаднага ладу са значэннем іншых ладоў. | 2 | Выканаць практыкаванне № 455 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 6.5. | Ужыванне формаў іншых ладоў і інфінітыва з пабуджальным значэннем. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 461 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 6.6. | Ужыванне формаў цяперашняга часу са значэннем іншых часоў. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 464 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 6.6. | Ужыванне формаў прошлага часу са значэннем іншых часоў. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 466 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 6.6. | Ужыванне формаў будучага | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № | Практыка- |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | часу са значэннем іншых часоў. | | 467 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | ванне |
| 6.7. | Ужыванне асабовых формаў з абагульнена асабовым і няпэўна асабовым значэннямі. | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 472 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 7.2. | Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 79 “Утварэнне дзеепрыметнікаў” // “Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам.” (Мінск, 1997). | Канспект |
| 7.3 | Ужыванне дзеепрыметнікаў. | 2 | Падрыхтаваць канспект артыкула Клышко А. Пра лямант -уючых і “лемантуючых” // Беларуская мова: Хрэстаматыя (Мінск, 2005) | Канспект. Вуснае паведамленне |
| 7.3. | Моўныя сродкі для замены неўласцівых беларускай мове дзеепрыметнікаў пры перакладзе. | 2 | Выканаць практыкаванне № 489 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 8.2. | Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трывання, іх утварэнне. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 85 “Утварэнне дзеепрыслоўяў” // “Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам.” (Мінск, 1997). | Канспект |
| 8.3. | Асаблівасці ўжывання дзеепрыслоўяў у беларускай мове. | 2 | Выканаць практыкаванне № 497 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 9.3. | Пераход слоў іншых часцін мовы ў прыслоўі (адвербіялізацыя). | 2 | Падрыхтаваць тэзісны канспект § 90 “Спосабы ўтварэння прыслоўяў” // “Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам.” (Мінск, 1997). | Тэзісны канспект |
| 10.1 | Ступені параўнання і формы ацэнкі безасабова прэдыкатыўных слоў, суадносных з якаснымі прыслоўямі. | 2 | Выканаць практыкаванне № 518 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 12.2. | Сінаніміка прыназоўнікавых канструкцый. | 2 | Падрыхтаваць канспект § 99 “Сінаніміка прыназоўнікаў” // “Сучасная беларуская літаратурная мова: Марфалогія: вучэб. дапам.” (Мінск, 1997). | Канспект |
| 13.1. | Адрозненне злучнікаў ад злучальных слоў – адносных займеннікаў і | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 539 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” | Практыка-ванне |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| | займеннікавых прыслоўяў. | | (Мінск, 1995). | |
| 14.1. | Формаўтваральныя і словаўтваральныя часціцы | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванне № 550 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| 16.1 | Адрозненне гукапераймальных слоў ад выклічнікаў | 2 | Выканаць пісьмова практыкаванні № 569 і № 571 // “Сучасная беларуская літаратурная мова: практ. заняткі” (Мінск, 1995). | Практыка-ванне |
| | **ВСЕГО:** | **48** | | |

## ЗАДАННІ ДА РЭЙТЫНГАВЫХ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

### Рэйтынгавая кантрольная работа № 1 (4 семестр)

*Тэма 6.1 – 6.11*
*Заданне:*
*1. Выканайце тэставыя заданні.*

### Варыянт 1

**1. *Адзначце неспрагальныя формы дзеяслова:***

1) інфінітыў
2) асабовая форма;
3) дзеепрыметнік; ;
4) дзеепрыслоўе;
5) форма прошлага часу.

***2. Адзначце формы дзеяслова, якім характэрны катэгорыі трывання, часу і стану:***

1) упрыгожаны;
2) упэўніць;
3) намаляваць;
4) выгадаваўшы;
5) сню.

***3. Адзначце, на ўзор якога тыпу спражэння змяняюцца дзеясловы*** відаць, чуваць***:***

1) першага;
2) другога;
3) не змяняюцца; словамі;
4) рознаспрагальныя;
5)з'яўляюцца безасабова-прэдыкатыўнымі.

***4. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеяслоўныя формы выконваюць ролю акалічнасці:***

1) Такім ранкам не ведаеш, *ісці* ў лес ці не (М.Кусянкоў);

2) Забягаў у рэдакцыю часопіса *вырашыць* пытанне з рукапісам свайго рамана ці аповесці, каб праз некалькі хвілін бегчы ў нейкае іншае месца, па нейкіх – зноў жа не менш неадкладных, не менш важных клопатах (А.Кудравец);

3) Я чуў гэтую песню амаль кожны дзень, калі грузіў разам з хлопцамі на машыны высахлы з лета торф: мы прыехалі сюды з горада *нарыхтоўваць* паліва (М.Стральцоў);

4) Зімой, пасля каляд, Пятрусь пачаў *збірацца ісці* на службу (Максім Танк);

5) Вячаслаў Пятровіч прыгладзіў рукой валасы і падышоў *напіцца* (М.Стральцоў).

***5. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеясловы непераходныя:***

1) Не *вымавіш* слова, не кранеш рукою – стой, слухай, любуйся (М.Лужанін);

2) Байцы і некалькі чалавек цывільных *занялі* абарону вакол пакгауза (В.Хомчанка);

3) На століку *было* шмат розных бліскучых пруточкаў, шчыпчыкаў, шкляначак (У.Юрэвіч);

4) *Грыміць, гудзе* ўсё недарэчнае, штораз віхор гучней, прудчэй (У.Жылка);

5) Аднойчы *бяжыць* буразубка па лесе і бачыць: сядзіць вавёрка на елцы і нанізвае апенькі на сучок (І.Галубовіч).

***6. Адзначце спалучэнні слоў з ускосна-зваротнымі дзеясловамі:***

1) да зімы рыхтавалася ўсё жывое;
2) мяцеліцы разгуляліся;
3) вавёрачкі стараліся з ранку да вечара;
4) збіралася на навальніцу;
5) наеўся пірагоў.

***7. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеясловы ўжыты з творным сродку дзеяння:***

1) Сэрца ночы *ачышчаецца* слязамі імжы… Вятры апрануліся ў холад (А.Братка);

2) Праз гады тая майская ноч салаўём у душы *страпянецца* (У.Паўлаў);

3) Белы золак, як белы паўлін, *выхваляецца* ўзорамі ззяння там, дзе зноў заблудзіўся ўспамін між спатканнем са сном і расстаннем (Т.Бондар);

4) Абодва ланцужкі дзяліліся на групы захопу і цывільных, “істрабкоў”, якія павінны былі *рассыпацца* ланцугом па перыметры вострава, акружыць яго і, сціскаючы ачапленне, рухацца да цэнтра, да шпіталя (П.Місько);

5) Буслы да нас вясною зноўку *вернуцца*, як на зямлі прадзюбнецца трава (П.Панчанка).

***8. Адзначце двухтрывальныя дзеясловы:***

1) адсарбіравацца;
2) гумаваць (насычаць гумай);
3) калькаваць;
4) нармаваць;
5) паведамляць.

***9. Адзначце, як утвараюцца суадносныя трывальныя пары:***

1) суфіксальным спосабам;
2) прыставачным спосабам;
3) шляхам аманіміі;
4) зменай месца націску;
5) суплетывізмам асноў.

***10. Адзначце дзеясловы з аднакратным значэннем:***

1) павудзіць;
2) павянуць;
3) падмануць;
4) памарную;
5) разгарнуць.

***11. Адзначце дзеясловы ў значэнні загаднага ладу:***

1) вітаюцца;
2) ві;
3) няхай усміхнецца;
4) пасябраваў бы;
5) памаўчым.

***12. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеясловы ў значэнні ўмоўнага ладу:***

1) Але няма на свеце такіх скарбаў, што б вечна *цешылі* наша сэрца (Цётка);

2) Ён (Багдановіч) з запалам мроіў аб тым, каб з беларускай (крыўскай) інтэлігенцыі ўзгадаваць сапраўднага генія слова, які б паказаў свайму народу не толькі красу роднай мовы, але *даў* бы творы з агульналюдскімі цэннасцямі (В.Ластоўскі);

3) – Коля бяжыць за казякамі, а я каб пайшоў, *не было* б чым *падаслаць* карову. Нашу ў хлеў галехавае лісце (В.Адамчык);

4) Думаю: калі б я *жыў* гэтак, у прыродзе, то і мяне б, магчыма, *знайшоў* ліст якога-небудзь сучаснага Рэпіна? (В.Карамазаў);

5) Літвінюк бы *чакаў* завуча: толькі спынілася машына, ён паказаўся ў двары, накульгваючы, здалёк прыязна ўсміхаючыся, ішоў да каліткі (А.Дзятлаў).

***13. Адзначце граматычныя катэгорыі, уласцівыя асабовым формам дзеяслова:***

1) склон;
2) трыванне;
3) лік;
4) час;
5) стан.

***14. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеясловы ўжыты ў значэнні прошлага часу:***

1) Я *быў ступіў* ужо да бліндажа, як раптам у цеславіне нешта зашоргалася, затрапяталася, а потым ураз трывожна піснула, палахліва заценькала, забілася нейкая птушка (М.Стральцоў);

2) – Каб мне зараз *была* на нарадзе. Другі раз гаварыць не буду! (В.Быкаў);

3) Дождж *ліў* як з вядра, бывала, што і ўперамешку з градам (Я.Галубовіч);

4) Была сярэдзіна восені, якраз тая пара, калі ў вёсках *капаюць* бульбу і над зямлёю ранкам *сцелецца* ні то дым, ні то туман, а днём з чыстага падсінелага неба свеціць цёплае яснае сонца… (В.Гігевіч);

5) У чаротах нямала *водзіцца* дзікіх качак, бо адтуль даносяцца ўсплескі, прыглушаныя ўскрыкі качара, які, мабыць, заўважыў людзей, папярэджвае чараду аб небяспецы (І.Капыловіч).

***15. Адзначце дзеясloў, які можна лічыць неасабовым:***

1) чырванеюць;
2) маеш;
3) разрастуцца;
4) гуляў;
5) знайду.

***16. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеясловы безасабовыя:***

1) Няма ж нічога благога ў тым, калі чалавек ступае на адну і тую ж сцежку двойчы і калі на яго ад гэтага *находзяць* успаміны (М.Стральцоў);

2) *Дыхалася* лёгка: скрозь ляжала прывялая трава, чаруючы рознымі пахамі (І.Чыгрынаў);

3) Толькі што *развіднела*. Па небе плылі нізкія хмары; зямля дыхала восеньскай вільгаццю (І.Навуменка);

4) За роўняддзю вялікай, зіхоткай ад усходу вады – далёкая града ці грыва лазняку. Адтуль *чуваць* салавей, як быццам тут ён недзе, зусім блізка (Янка Брыль);

5) *Змянілася*, багата чаго *змянілася* з тых дзён, як прыйшоў сюды, паставіў першую хату чалавек (Б.Сачанка).

***17. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-ой асобы множнага ліку ўжываюцца з канчаткамі -аце, -яце:***

1) даваць;
2) есці;
3) сесці;
4) стаяць.
5) гарэць;

***18. Адзначце дзеясловы 2 спражэння:***

1) бегчы;
2) ліць;
3) ляцець;
4) гнуць;
5) легчы.

***19. Адзначце, які спосаб утварэння не характэрны для дзеясловаў:***

1) прыставачны;
2) суфіксальны;
3) прыставачна-суфіксальны;
4) абрэвіяцыя;

5) постфіксальны.

**20. Дапоўніце адказ:**

Да рознаспрагальных дзеясловаў належаць *бегчы, даць* … .

**Варыянт 2**

***1. Адзначце агульныя прыкметы, уласцівыя спрагальным і неспрагальным формам дзеяслова:***

1) лексічнае значэнне;
2) катэгорыі трывання і стану;
3) катэгорыі ладу і зваротнасці;
4) кіраванне;
5) прымыканне прыслоўя.

***2. Адзначце формы дзеяслова, якім характэрны катэгорыі трывання, часу, стану:***

1) паснедаў;
2) пажаўцелы;
3) заснуўшы;
4) зжаты;
5) кірую.

***3. Адзначце дзеясловы, якія маюць наступную марфемную будову: ∩^:***

1) прасці;
2) узысці;
3) пакліч;
4) мыць;
5) легчы.

***4. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеяслоўныя формы выконваюць ролю азначэння:***

1) Пастаяў я на двары, падумаў, паслухаў ваколіцу, насцярожліва-чуйную, і нечакана павесялеў ад думкі *сабрацца схадзіць* у лес па грыбы (М.Стральцоў);

2) Стала лепей – захацелася яшчэ *пажыць* (А.Кудравец);

3) Яна [Зіна] не пазірала на дарогу, толькі спадзявалася, – з усёй моцы свае маладой душы, з вялікай прагай *жыць* (В.Быкаў);

4) Надышла пара *вяртацца* ў горад (М.Стральцоў);

5) Нізкія домікі зносяць, капаюць экскаватарамі катлаваны, таму прыходзіцца *ісці* па дашчаным тратуары ўздоўж драўляных шчытоў, якімі агароджана будаўнічая пляцоўка (І.Навуменка).

***5. Адзначце сказы з пераходнымі дзеясловамі:***

1) Так лёгка і п’яна *пахла* маладое лісце, *зелянела* трава з залатымі галоўкамі дзьмухаўцоў, а дзесьці, каля нізінкі з неапалай вадой, пакрысе расспеўваўся салавей (М.Лужанін);

2) *Сказалі*, што нейкая банда прарвалася ў нашы лясы і быў з ёю бой (В.Хомчанка);

3) Лукашок любіў, калі бабуля *давала* яму жменю гароху (У.Юрэвіч);

4) А зімою ноч падглядае доўга, сцішна пад акном, як *прадзеш, прадзеш*, не радая, не пазбудзеш думак сном (У.Жылка);

5) Няпрошаная госця пасядзела яшчэ крыху, а потым спрытна кульнулася з галінкі і *знікла* ў гушчыні сасновага бору (І.Галубовіч).

***6. Адзначце словазлучэнні з уласна-зваротнымі дзеясловамі:***

1) перабіраюся праз кладку;
2) сталі ласавацца пірагом;
3) дрэвы за сонца чапляюцца;
4) барсук мітусіцца, хатку на зіму робіць;
5) пусці пагрэцца.

***7. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеясловы ўжыты з творным суб'екта:***

1) Адно здзівіла ўсіх: на свеце паўвека Ганна пражыла, не *друкавалася* ў газеце, карэспандэнтам не была (П.Пранузa);

2) Вядома, не гэта я мерыўся бачыць, а тое, чым Іўе прад іншымі значыць… Мо так *планавалася*, выйшла мо гэтак, – мы трапілі найперш на выстаўку кветак (У.Паўлаў);

3) А пасля фабрыка стала вялікая, на маіх вачах яна *рабілася* людзьмі (Кузьма Чорны);

4) Транспартнай камендатурай Мінска *паведамляецца* пра наступнае: цягнік Мінск – Полацк быў абстраляны бандай, узброенай цяжкой зброяй, у часе бою перабіта ахова (І.Чыгрынаў);

5) З паэзіяй мне *развітацца* пара, пакуль не зрабіўся сапраўдным вар'ятам (П.Панчанка).

***8. Адзначце аднатрывальныя дзеясловы:***

1) недагледзець;
2) гусцець;
3) змагацца;
4) прыдбаць;
5) ганарыцца.

***9. Адзначце дзеясловы, што ўтвараюць суадносныя трывальныя пары:***

1) шыць;
2) супярэчыць;
3) тампанаваць;
4) загортвацца;
5) ужывіць.

***10. Адзначце спосабы дзеяслоўнага дзеяння:***

1) шматкратнасці;
2) перарывістасці;
3) лінейнасці;
4) выніковасці;
5) абмежаванасці ў часе.

***11. Адзначце дзеясловы ўмоўнага ладу:***

1) напісала;
2) узнялася б;
3) калі б не ўсміхнулася;
4) засвяці;
5) давай паспрабуем.

***12. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеясловы ў значэнні загаднага ладу:***

1) *Трэба сустракаць* людзей толькі добрым словам, каб вярнуўся госць на радзіму і паведаміў праўду пра нашу Беларусь ("Беларуская думка");

2) – Эй, вы, – сказаў нарэшце я, грукнуўшы кулаком у шкло будкі, – *давай закругляцца*! (М.Стральцоў);

3) У нас хапае рэдкіх слоў, і *палюбі* ты іх бязмежна. Яны ад чысціні снягоў і ад пялёсткаў беласнежных (Ю.Свірка);

4) Пакуль што будзем лячыцца, браток. І рэжым, рэжым *не парушаць*… (І.Галубовіч);

5) Мой зямляк пастаянна прыпыняўся каля аркад – вельмі мілых, аднолькавых па велічыні арак – і заўсёды ахаў: – Дзіва дзіўнае, хоць бы адна аркада *абсыпалася* ці *абвалілася*? (В.Лапцік).

***13. Адзначце граматычныя катэгорыі, уласцівыя інфінітыву:***

1) трыванне;
2) пераходнасць;
3) зваротнасць;
4) час;

5) спражэнне.

***14. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеясловы ўжыты ў значэнні будучага часу:***

1) Ля Еўсюковага свірна па-ранейшаму нікога не было, ды і хто туды прыйдзе, калі брыгадзір спіць. Ну я вас *пабуджу*, зласліва думаў Выпаўзак, я вам *пасвяткую*… (В.Быкаў);

2) Пні шчапаліся на смалякі. Для падпалу нічога лепшага *не знойдзеш*. Лічы, жывая смала… (А.Кудравец); 3) – Я тут *задрамаў быў* трохі, – беручыся за шклянку, вялавата сказаў ён [Вячаслаў Пятровіч] (М.Стральцоў);

4) Кошаль разумеў, калі вернецца ў вёску, па першым часе будзе шчаслівы, а потым *засумуе* і ўжо не будзе заўважаць той прыгажосці, якую заўважае здаля ад дому (В.Гігевіч);

5) Бывала, арэш ці памагаеш капаць бульбу і *пачуеш* над полем ціхі і смутны жураўліны крык (В.Каваленка).

**15. Адзначце дзеясловў, які можна лічыць неасабовым:**

1) усміхаюцца;
2) забялее;
3) адчуваеш;
4) сплюшчымся;
5) адстаў.

***16. Адзначце сказы, у якіх выдзеленыя дзеясловы безасабовыя:***

1) Хораша *пахла* з каляін вільготным сасновым карэннем, а з дробных хмызоў – свежым лісцем, а потым неяк нечакана і саладкавата-густа *патыхнула* водарам ад зламанага пры дарозе куста крушыны (М.Стральцоў);

2) За горадам яшчэ ляжаў снег і былі праталіны, што *пахнулі* зямлёю… (У.Караткевіч);

3) Праўда, *ехаць* па вуліцы *давялося* нядоўга, усяго напачатку, пасля дарога забірала направа і зноў знікала ў лесе (І.Чыгрынаў.);

4) У першай частцы тэксту, выбітага на срэбных з пазалотаю пластках, *паведамляецца* пра кошт дарагіх металаў і камянёў, якія пайшлі на аздабленне крыжа, і плату, якую атрымаў сам Лазар Богша (У.Арлоў);

5) І ўсё раптам у адзін момант *памаладзела, змянілася, ажыло* (М.Капыловіч).

***17. Адзначце дзеясловы, якія ў форме 2-ой асобы множнага ліку ўжываюцца з канчаткамі -аце, -яце:***

1) бегчы;
2) належаць;
3) марыць;
4) везці;
5) гуляць.

***18. Адзначце дзеясловы 1 спражэння:***

1) даць;
2) хацець;
3) баяцца;
4) вучыць;
5) бяліць.

***19. Адзначце, які спосаб утварэння характэрны для дзеясловаў:***

1) прыставачны;
2) асноваскладанне;
3) складана-суфіксальны;

4) нульсуфіксальны;

5) абрэвіяцыя.

***20. Дапоўніце адказ:***

Дзеяслоўныя формы могуць пераходзіць у мадальныя словы, словы катэгорыі стану, злучнікі, прыназоўнікі, часціцы і … .

**Рэйтынгавая кантрольная работа № 2 (4 семестр)**

*Тэмы 11.1 – 14.2*

*Заданні:*

*1. Запішыце тэкст пад дыктоўку.*

*2. Зрабіце марфалагічны аналіз выдзеленых слоў.*

Лёс не быў асабліва спагадлівы да яго. Жыццёвы шлях Францішка Багушэвіча не ўсцелены ружамі, на творчым шляху Мацея Бурачка мы ведаем толькі асобныя вехі, магчыма, самыя значныя, якіх дастаткова для таго, ***каб***[2 варыянт] зразумець, убачыць, куды вёў гэты шлях.

Можна, вядома, са зразумелай упэўненасцю сказаць сёння: не змоўклі песні тыя, што іграў на дудцы, не забылі паэта. Але яму было вельмі балюча, бо ўбачыў у жыцці ў друку адно толькі сваё апавяданне, ***не***[2 варыянт] ведаў, які лёс чакае ***праз***[1 варыянт] гады яго зборнікі прозы і паэзіі, не прапушчаныя цэнзурай, што будзе праз гады з матэрыяламі да слоўніка, у якім меў намер пераўзысці самога Насовіча. І як хочацца думаць, што меў усё ***ж***[1 варыянт] суцяшэнне, надзею быць патрэбным у будучым свайму народу, сваёй літаратуры.

Багушэвіч здолеў прымусіць па-новаму загучаць беларускую мову – натуральна гнутка, афарыстычна і прыгожа. Гэта, трэба думаць, каштавала яму найвялікшых намаганняў, ***аднак***[1 варыянт] і таленту і намаганняў было б недастаткова, каб паэт не ведаў, як гавораць беларускія людзі не толькі на Ашмяншчыне, але і дзенебудзь пад Барысавам, адкуль узяў ён свайго Сымона Рэўку.

Ён турбаваўся і за чысціню мовы, за яе агульнанароднасць. І слоўнік свій складаў, мусіць, ***дзеля***[2 варыянт] таго, каб паказаць у ім не мову пэўнай мясцовасці, а мову ўсяго народа.

Пры жыцці Багушэвіча на ягоныя зборнікі была надрукавана адна-адзіная рэцэнзія. І часта тыя, хто нават чытаў паэтавы вершы, не ведалі сапраўднага імя творцы. Бязлітасны час захаваў нам вельмі мала звестак пра Францішка Багушэвіча, але ён, гэты час, і ўзнавіў, вымераў сапраўднае значэнне для нашай культуры сціплага судовага следчага, які быў першым у шэрагу вялікіх нацыянальных паэтаў (253словы).

Міхась Стральцоў. “Дудар беларускі”.

## ПЕРАЛІК СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ, ЯКІЯ ВЫКАРЫСТОЎВАЮЦЦА ПРЫ ВЫВУЧЭННІ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Для атрымання аб’ектыўнай інфармацыі аб узроўні паспяховасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Марфалогія” (модуль “Сучасная беларуская літаратурная мова”) мэтазгодна сістэматычна выкарыстоўваць розныя віды кантролю, сярод якіх: апераджальны, бягучы, тэматычны, прамежкавы і выніковы. Кожны з відаў кантролю выкарыстоўваецца на пэўным этапе навучання і выконвае ў педагагічным працэсе адну з функцый: стымулюючую, навучальную, дыягнастычную, выхаваўчую і інш.

З мэтай выніковай дыягностыкі якасці засваення тэарэтычнага і практычнага матэрыялу студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне “Марфалогія” (модуль “Сучасная беларуская літаратурная мова”) вучэбным планам прадугледжана правядзенне кантрольных работ рознага віду. Пры падборы заданняў улічваецца аб’ём тэарэтычных звестак па пэўнай тэме, індывідуальны ўзровень падрыхтоўкі навучэнцаў і інш.

Апераджальная, бягучая і прамежкавая дыягностыка кампетэнцый па вучэбнай дысцыпліне “Марфалогія” можа мець розныя формы, сярод якіх:

•вусны кантроль: франтальнае, індывідуальнае, ушчыльненае (камбінаванае) апытванне на лекцыях і практычных занятках, калёквіумы, вусныя залікі і экзамены;

•пісьмовы кантроль: тэрміналагічныя дыктанты, дыктанты з дадатковымі заданнямі, дыктанты для самакантролю, кантрольныя работы, пісьмовыя работы па аўдыторных (дамашніх) практыкаваннях, рэфераты, пісьмовыя залікі і экзамены;

•графічны кантроль: моўны разбор з дапамогай графічных сродкаў, графічны дыктант (запаўненне табліцы па пэўнай тэме);

•тэставы кантроль: выкананне тэставых заданняў адкрытага і закрытага тыпу.

Для дыягностыкі кампетэнцый, выяўлення вучэбных дасягненняў студэнтаў на прамежкавым і выніковым этапах рэкамендуецца выкарыстоўваць тэсты і тэставыя заданні, рознаўзроўневыя кантрольныя заданні. Рэкамендаваная выніковая форма кантролю – экзамен.

## ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЗАЛІКУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “МАРФАЛОГІЯ” (3 СЕМЕСТР)

1. Марфалогія як граматычнае вучэнне аб слове.
2. Асноўныя граматычныя паняцці і адзінкі (граматычная катэгорыя, граматычнае значэнне, граматычная форма, словаформа).
3. Паняцце парадыгмы (сукупнасці граматычных формаў слова).
4. Спосабы і сродкі выражэння граматычных значэнняў.
5. Часціны мовы як лексіка-граматычныя класы слоў. Крытэрыі выдзялення і аб’яднання слоў у часціны мовы.
6. Сістэма часцін мовы ў сучаснай беларускай літаратурнай мове. Самастойныя і службовыя часціны мовы.
7. Дыскусійныя пытанні класіфікацыі часцін мовы ў навуковай літаратуры. Пераходныя з’явы ў сістэме часцін мовы.
8. Назоўнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля.
9. Лексіка-семантычныя групы назоўнікаў.
10. Лексіка-граматычныя разрады назоўнікаў: агульныя і ўласныя, канкрэтныя і абстрактныя, адушаўлёныя і неадушаўлёныя, асабовыя, зборныя, рэчыўныя, адзінкавыя (сінгулятывы).
11. Катэгорыя роду назоўніка. Вызначэнне роду паводле семантычных і граматычных (марфалагічных, сінтаксічных) прымет.
12. Назоўнікі, якія адной граматычнай формай абазначаюць асоб мужчынскага і жаночага полу.Назоўнікі агульнага роду.
13. Несупадзенне роду некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах. Вызначэнне роду нескланяльных назоўнікаў і абрэвіятур.
14. Катэгорыя ліку назоўніка, яе граматычнае выражэнне.
15. Адзіночналікавыя (singularia tantum) і множналікавыя (pluralia tantum) назоўнікі.
16. Рэшткі парнага ліку ў беларускай мове. Несупадзенне ліку некаторых назоўнікаў у беларускай і рускай мовах.
17. Катэгорыя склону назоўніка. Асноўныя значэнні склонаў. Форма клічнага склону ў беларускай мове.
18. Скланенне назоўнікаў. Сістэма скланення назоўнікаў у сучаснай беларускай мове.Тыпы скланення. Парадыгма скланення назоўнікаў.
19. Першае скланенне назоўнікаў.
20. Другое скланенне назоўнікаў.
21. Трэцяе скланенне назоўнікаў.
22. Рознаскланяльныя назоўнікі. Нескланяльныя назоўнікі.
23. Скланенне назоўнікаў у множным ліку. Варыянтныя канчаткі назоўнікаў у множным ліку. Назоўнікі ад’ектыўнага і змешанага тыпу скланення.
24. Скланенне асабовых імёнаў, прозвішчаў і геаграфічных назваў.
25. Формы назоўнікаў з суфіксамі суб’ектыўнай ацэнкі.

26. Словаўтварэнне назоўнікаў. Марфалагічны, лексіка-семантычны і марфалагічна-сінтаксічны спосаб утварэння назоўнікаў.

27. Прыметнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

28. Граматычныя катэгорыі прыметніка (род, лік, склон), іх залежнасць ад адпаведных катэгорый назоўніка.

29. Лексіка-граматычныя разрады прыметнікаў(якасныя, адносныя, прыналежныя).

30. Якасныя прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці.

31. Адносныя прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці.

32. Прыналежныя (уласнапрыналежныя і агульнапрыналежныя) прыметнікі, іх значэнне і граматычныя асаблівасці.

33. Адрозненне якасных прыметнікаў ад адносных і прыналежных. Пераход прыметнікаў з аднаго разраду ў другі.

34. Поўныя (членныя), кароткія (нячленныя) і сцягнутыя (усечаныя) формы якасных прыметнікаў, іх выкарыстанне ў сучаснай беларускай мове.

35. Ступені параўнання якасных прыметнікаў. Простыя (сінтэтычныя) і складаныя (аналітычныя) формы вышэйшай і найвышэйшай ступеняў параўнання. Суплетыўныя формы. Спецыфіка элятыва ў беларускай мове.

36.Формы прыметнікаў са значэннем суб’ектыўнай ацэнкі і меры якасці. Памяншальна-ласкальныя і павелічальна-ўзмацняльныя суфіксы, суфіксы са значэннем непаўнаты і высокай меры якасці.

37. Скланенне прыметнікаў. Канчаткі прыметнікаў адзіночнага ліку. Варыянтныя канчаткі прыметнікаў жаночага роду ў родным і творным склонах адзіночнага ліку.

38. Канчаткі прыметнікаў множнага ліку.

39. Асаблівасці скланення прыналежных прыметнікаў.

40. Словаўтварэнне прыметнікаў. Марфалагічны, лексіка-семантычны і марфалагічна-сінтаксічны спосаб утварэння прыметнікаў.

41. Лічэбнік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

42. Разрады лічэбнікаў паводле значэння: колькасныя (уласнаколькасныя, зборныя, дробавыя) і парадкавыя лічэбнікі.

43. Разрады лічэбнікаў паводле структуры: простыя, складаныя і састаўныя лічэбнікі.

44. Асаблівасці сінтаксічнай сувязі лічэбнікаў з назоўнікамі.

45. Скланенне колькасных і парадкавых лічэбнікаў.

46. Няпэўна-колькасныя словы.

47. Займеннік як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

48. Групы займеннікаў паводле суадноснасці з іншымі часцінамі мовы: абагульнена-прадметныя, абагульнена-якасныя, абагульнена-колькасныя.

49. Разрады займеннікаў паводле значэння: асабовыя, зваротны, прыналежныя, указальныя, азначальныя, пытальныя, адносныя, адмоўныя і няпэўныя.

50. Лексіка-граматычная характарыстыка займеннікаў розных разрадаў.

51. Словаўтварэнне займеннікаў. Марфалагічны і марфалагічна-сінтаксічны спосаб утварэння займеннікаў.

52. Скланенне займеннікаў.

## ПЕРАЛІК ТЭАРЭТЫЧНЫХ ПЫТАННЯЎ ДА ЭКЗАМЕНУ ПА ДЫСЦЫПЛІНЕ “МАРФАЛОГІЯ” (4 СЕМЕСТР)

1. Дзеяслоў як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы і сінтаксічная роля дзеяслова. Сістэма катэгорый і формаў дзеяслова.
2. Інфінітыў як пачатковая форма дзеяслова. Граматычныя катэгорыі інфінітыва. Суфіксы інфінітыва. Сінтаксічная роля інфінітыва.
3. Асновы дзеяслова: інфінітыва і цяперашняга (будучага простага) часу. Аснова прошлага часу. Утварэнне дзеяслоўных формаў ад гэтых асноў.
4. Пераходныя і непераходныя дзеясловы.
5. Зваротныя дзеясловы.
6. Катэгорыя стану дзеясловаў, яе сувязь з пераходнасцю/непераходнасцю, зваротнасцю/незваротнасцю.
7. Актыўныя і пасіўныя канструкцыі і іх ужыванне ў мове. Творны дзейнага прадмета і творны сродку дзеяння пры дзеясловах залежнага стану.
8. Катэгорыя трывання. Сувязь катэгорыі трывання з катэгорыяй часу. Дзеясловы закончанага і незакончанага трывання. Няпарныя (аднатрывальныя) дзеясловы. Дзеясловы са значэннем абодвух трыванняў (двухтрывальныя).
9. Суадносныя пары трывання. Спосабы ўтварэння трыванняў. Ступеннае ўтварэнне трывання. Трыванне дзеясловаў руху.
10. Катэгорыя ладу. Сувязь катэгорыі ладу з катэгорыяй часу. Абвесны лад.
11. Загадны лад. Утварэнне формаў загаднага ладу. Ужыванне формаў загаднага ладу са значэннем іншых ладоў. Ужыванне формаў іншых ладоў і інфінітыва з пабуджальным значэннем.
12. Умоўны лад, яго ўтварэнне і значэнне. Паходжанне формы ўмоўнага ладу. Ужыванне формы ўмоўнага ладу.
13. Катэгорыя часу. Сувязь катэгорыі часу з катэгорыяй трывання і ладу. Абсалютны і адносны час. Значэнні формаў часу. Утварэнне формаў часу.
14. Цяперашні час, яго значэнне. Ужыванне формаў цяперашняга часу са значэннем іншых часоў.
15. Прошлы час, яго значэнне. Простая і складаная формы прошлага часу, іх паходжанне. Асаблівасці ўжывання складанай формы прошлага часу. Ужыванне формаў прошлага часу са значэннем іншых часоў.
16. Будучы час, яго формы і значэнні. Ужыванне формаў будучага часу са значэннем іншых часоў.
17. Катэгорыя асобы. Сувязь катэгорыі асобы з катэгорыямі ладу і часу. Формы асобы, іх значэнне і ўжыванне. Ужыванне асабовых формаў дзеяслова з абагульнена-асабовым і няпэўна-асабовым значэннямі.

18. Безасабовыя дзеясловы, іх семантычныя і граматычныя асаблівасці. Уласна безасабовыя дзеясловы і асабовыя дзеясловы са значэннем безасабовых. Зваротныя безасабовыя дзеясловы.

19. Спражэнне дзеясловаў. Рознаспрагальныя дзеясловы. Рэшткі нетэматычнага спражэння (дзеясловы есці, даць).

20. Утварэнне дзеясловаў. Спосабы і сродкі дзеяслоўнага словаўтварэння.

21. Дзеепрыметнік як форма дзеяслова. Поўная і кароткая форма дзеепрыметніка.

22. Дзеепрыметнікі незалежнага і залежнага стану, іх утварэнне.

23. Асаблівасці ўжывання дзеепрыметнікаў у сучаснай беларускай літаратурнай мове. Пераход дзеепрыметнікаў у прыметнікі (ад'ектывацыя).

24. Дзеепрыслоўе як форма дзеяслова. Адноснае абазначэнне часу дзеепрыслоўямі.

25. Дзеепрыслоўі незакончанага і закончанага трывання, іх утварэнне.

26. Асаблівасці ўжывання дзеепрыслоўяў. Выпадкі пераходу дзеепрыслоўяў у прыслоўі (адвербіялізацыя).

27. Прыслоўе як часціна мовы. Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

28. Разрады прыслоўяў паводле значэння: азначальныя (якасныя, спосабу дзеяння, колькасныя (меры і ступені)) і акалічнасныя (месца, часу, прычыны, мэты).

29. Ступені параўнання якасных прыслоўяў. Формы суб'ектыўнай ацэнкі якасных прыслоўяў.

30. Утварэнне прыслоўяў ад розных часцін мовы. Ужыванне прыслоўяў у ролі іншых часцін мовы.

31. Безасабова-прэдыкатыўныя словы (катэгорыя стану). Катэгарыяльнае (абагульненае) значэнне, марфалагічныя прыметы, сінтаксічная роля.

32. Лексіка-семантычныя групы безасабова-прэдыкатыўных слоў. Групы безасабова-прэдыкатыўных слоў па суаднoснасці з іншымі часцінамі мовы (назоўнікамі, прыметнікамі, прыслоўямі, дзеясловамі). Уласна безасабова-прэдыкатыўныя словы.

33. Пытанне пра безасабова-прэдыкатыўныя словы ў лінгвістычнай літаратуры.

34. Прыназоўнік як службовая часціна мовы, яго функцыі. Разрады прыназоўнікаў паводле паходжання і паводле структуры.

35. Ужыванне прыназоўнікаў з рознымі склонамі. Асноўныя значэнні прыназоўнікаў.

36. Сінаніміка прыназоўнікавых канструкцый. Асаблівасці ўжывання прыназоўнікаў у беларускай мове.

37. Злучнік як службовая часціна мовы. Адрозненне злучнікаў ад злучальных слоў – адносных займеннікаў і займеннікавых прыслоўяў.

38. Разрады злучнікаў паводле паходжання, структуры, спосабу ўжывання і функцыянальнага прызначэння.

39. Злучальныя злучнікі і іх групы.

40. Падпарадкавальныя злучнікі і іх групы.

41. Далучальныя злучнікі. Паясняльныя злучнікі.

42. Часціцы як службовая часціна мовы. Разрады часціц паводле паходжання, структуры і функцыі.

43. Часціцы, якія выражаюць дадатковыя сэнсавыя адценні.

44. Мадальныя і мадальна-валявыя часціцы.

45. Эмацыянальна-экспрэсіўныя часціцы.

46. Формаўтваральныя і словаўтваральныя часціцы.

47. Мадальныя словы як асобая часціна мовы. Семантыка, структура і сінтаксічныя асаблівасці мадальных слоў.

48. Разрады мадальных слоў паводле значэння.

49. Суадноснасць мадальных слоў са словамі іншых часцін мовы.

50. Пытанне аб мадальных словах у лінгвістычнай літаратуры.

51. Выклічнік як асобая часціна мовы. Разрады выклічнікаў паводле значэння і паводле паходжання.

52. Гукаперaймальныя словы, іх адрозненне ад выклічнікаў.

# ПРЫКЛАДЫ КАМПЕТЭНТНАСНА АРЫЕНТАВАНЫХ ЗАДАННЯЎ

## Кампетэнтнасна арыентаванае заданне № 1

**Утварыце ад прапанаваных пераходных дзеясловаў дзеясловы залежнага стану.**

Выконваць заданне, гатаваць вячэру, даследаваць праблему, збіраць грыбы, размарожваць халадзільнік, пісаць курсавую працу, заплятаць валасы, маляваць карціну, падпісаць загад, капаць бульбу, лавіць рыбу.

## Кампетэнтнасна арыентаванае заданне № 2

**Знайдзіце словазлучэнні з ненарматыўнымі для беларускай мовы дзеепрыметнікамі. Чаму вы іх аднеслі да памылак? Адкарэкціруйце гэтыя словазлучэнні і запішыце выпраўленныя варыянты.**

Трымаючыйся абедзвюма рукамі, недаспелыя ягады, падрыхтаваны да вясны, прачнуўшыся хлопчык, глядзячы праз акуляры, выцертый насуха, створаны паэтам, падняўшыеся сонца, заплюшчаныя вочы, пажоўклыя дрэвы, засланны ложак.

## Кампетэнтнасна арыентаванае заданне № 3

**Вызначце лад дзясловаў у прапанаваных сказах.**

1. Адно. Што параіў бы: не закончыўшы справы, ніколі не хваліся (М.Лынькоў). 2. Ты схадзіў бы, Максімка, пераведаў бы родных (І.Шамякін). 3. Як ні старайся – усё яму дрэнна. 4. Не тапталі б травіцу, берaглі б яе, хадзілі б сцежкай (У.Дубоўка). 5. Я хацеў бы закончыць нашу размову (К.Крапіва).
6. – Пайшлі, – сказала яна. – А то на нгас звяртаюць увагу (І.Шамякін). 7. Няхай і паркі, і сады шумяць зялёным чуйным веццем…(Х.Гурыновіч). 8. Не шукайце красы за морамі, узбярэжжаў з крыштальнымт зорамі, – прыязджайце да нас на Полаччыну, пахадзіце яе прасторамі (Г. Бураўкін).

## ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ УВА

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца ўзгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы ўстановы вышэйшай адукацыі па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, што распрацавала вучэбную праграму |
|---|---|---|---|
| “Уводзіны ў мовазнаўства”, “Гісторыя беларускай літаратурнай мовы”, “Беларуская дыялекталогія”, “Культура маўлення педагога” | Кафедра мовазнаўства і лінгвадыдактыкі | Дубліраванне вучэбнага матэрыялу і неістотныя супярэчнасці паміж праграмамі ліквідаваны на этапе распрацоўкі вучэбных праграм. | Лічыць праграму ўзгодненай з дысцыплінамі на стадыі яе падрыхтоўкі (пратакол № __ ад _____2024 г.). |